КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 36 (1527)
4 верасня 2021 г.

11 верасня 2021 года ў Верхнім горадзе Мінска адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Рэпартаж са свята — у наступным нумары.

ст. 16

Апошнія штрыхі да параднага партрэта

Штогод у сузор'і Свята беларускага пісьменства запальваецца чарговая зорка. Сёлета гэта горад Капыль. Паводле ўжо ўсталяванай традыцыі, свята ладзіцца ў гарадах, што адыгралі значную ролю ў развіцці асветы, кнігадруку, культуры ўвогуле. Паколькі Капыльшчына дала краіне нямала майстроў слова, ёй і нададзены гонар ладзіць імпрэзу нацыянальнага маштабу.

Напярэдадні 5 верасня наш карэспандэнт наведаў Капыль. Ягоны фотарэпартаж — пра перадсвяточныя будні горада.

Працяг на ст. 3.

Ёсць пытанне!

БЕЛАРУСКАЕ КІНО: НЕ "КОЛА", А "ДРЭВА"

Бясконцае падарожжа па замкнёным коле. Так можна апісаць існаванне беларускага кіно апошніх трох дзесяцігоддзяў...

ст. 6

Суайчыннікі

З УДЗЯЧНАСЦЮ ДА БЕЛАРУСІ

"Мы шмат гадоў жывём не ў беларускім моўным і культурным асяроддзі, таму кожнае паглыбленне ў беларускую культуру — як глыток свежага паветра", — гаворыць кіраўніца Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры Жанна Раманоўская. Інтэрв'ю з ёй на

ст. 13

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Да Дня народнага адзінства

31 жніўня адбылася чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў Міністэрства. З дапамогай сродкаў відэасувязі удзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Падчас нарады падымаліся самыя розныя пытанні. Асноўны акцэнт на нарадзе быў зроблены на падрыхтоўцы і правядзенні ў краіне Дня народнага адзінства 17 верасня. Было адзначана, што 16 верасня ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь будзе арганізаваны шэраг выстаў, а таксама пройдзе шырокафарматны тэлемост з удзелам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай, іншых прадстаўнікоў цэнтральных і рэгіянальных улад. У Мінску да Дня народнага адзінства будзе ўсталяваны памятны знак «Уз'яднанне». Дарэчы, да дадзенай падзеі па ініцыятыве Міністэрства культуры ў Музеі народнай архітэктуры і побыту пад Мінскам будзе пасаджаны сад. Дарэчы, урачыстыя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Таксама адзначалася, што зараз дзень за днём ажыццяўляецца падрыхтоўка да Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад". На дадзены момант план працы дадзенага кінафоруму вызначаны, падрыхтавана і праграма паказальных мерапрыемстваў і сустрэч, майстар-класаў. У гэтым годзе фестываль будзе праходзіць пад дэвізам "Кіно — сімфонія адзінства", у яго ўжо ёсць і новая дырэкцыя, якую прадстаўляе "Беларусьфільм". Да сярэдзіны верасня запрацуе і сайт кінафестывалю — Listopad.org.

Абмяркоўвалася і правядзенне XXV Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Белая вежа", які адкрыецца ў Брэсце 10 верасня са спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы "Паўлінка". На трох сцэнарных пляцоўках горада пакажуць 22 спектаклі, прадстаўленыя тэатрамі 7 краін.

Вялікую ўвагу выклікала і выкладзеная міністру інфармацыя пра наведванне 13 жніўня прадстаўнікамі міністэрства культуры Брэсцкага рэгіёна, вывучэння становішча на месцах у галіне культуры. Было наведана 86 устаноў культуры, 33 грамадзян прыйшлі на асабісты прыём, адбыліся і размовы праз тэлефон ў рамках прамой тэлефоннай лініі. Усе пытанні вывучаны, абагульнены, і на іх будуць дадзены адказы. У бліжэйшы час работнікі Міністэрства культуры ў сувязі з гэтым сустрэнуцца і з прадстаўнікамі Брэсцкага рэгіёна. "Такая практыка наведвання і вывучэння рэгіёнаў краіны стане пастаяннай", — падкрэсліў Анатолій Маркевіч.

К

Дзень ведаў

1 верасня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбылося ўрачыстае мерапрыемства "Саджанец ведаў", прымеркаванае да Дня ведаў і пачатку новага навучальнага года. Ва ўрачыстасці прымаў удзел міністр культуры Анатолій Маркевіч і рэктар Наталля Карчэўская. Напрыканцы мерапрыемства міністр разам з педагогамі на тэрыторыі ўніверсітэта пасадзіў бэз.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Газета – рэгіёны – чытач

— 27 жніўня адбыўся Форум работнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры. На падобнага кшталту мерапрыемства педагогі галіны збіраліся ўпершыню. Што асабліва запомнілася ўдзельнікам?

Людміла Аніскіна, дырэктар Навагрудскай дзіцячай школы мастацтваў:

— Нашу школу на Форуме прадстаўлялі я і яшчэ тры педагогі. Уражанні ад мерапрыемства самыя пазітыўныя. На Форуме, з майго пункту гледжання, уздымаліся сапраўды актуальныя пытанні. Адно з іх, якое тычыцца і ўзнікаючай у нас праблематыкі, — магчымасць працягваць выпускнікам школы мастацтваў вучобу яшчэ адзін год перад паступленнем на другую ступень адукацыі. Гэта актуальна, калі вучань выпускаецца са школы мастацтваў, а ў сярэдняй школе яму патрэбна скончыць яшчэ клас, і бывае досыць часта. Цяпер жа выпускніку можна будзе вучыцца без праблем яшчэ год у школе мастацтваў, каб не губляць свае навыкі. Многа на Форуме гаварылася пра другую ступень адукацыі ў сферы культуры, пра тое, што трэба захаваць яе прэстыжнасць і якасць. Падкрэслівалася, што гэта і наша задача, накіроўваць туды здольных і падрыхтаваных вучняў. Даводзілася, што самая вялікая ўвага будзе надзяляцца забеспячэнню музычных школ інструментамі, а таксама падрыхтоўцы наладчыкаў і гукаапаратараў. Адбылося ўзнагароджванне лепшых работнікаў нашай галіны, а святочны канцэрт уразіў высокім мастацкім узроўнем.

— У гэту суботу, 4 верасня, на Шчучыншчыне пройдзе фестываль фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы". Што на ім адбудзецца?

Сняжана Куратчык, намеснік начальніка Кіравання культуры Гродзенскага аблвыканкама:

— Задачамі фестывалю з'яўляюцца захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны, адраджэнне і развіццё лепшых традыцый нацыянальнай культуры, далучэнне да іх шырокіх слаёў грамадства, выяўленне самабытных носьбітаў беларускага фальклору, далучэнне дзяцей і моладзі да гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Фестываль адбываецца адзін раз у два гады і праводзіцца ў два туры: адборачны і другі тур, заключныя мерапрыемствы пройдуць у гэту суботу. Для удзелу ў другім туры журы адабрала лепшыя фальклорныя калектывы і індывідуальных выканаўцаў, майстроў народнай творчасці. Па выніках іх выступленняў вызначаць лаўрэатаў у наступных намінацыях: аўтэнтычны фальклорны гурт, дарослы і дзіцячы фальклорны ансамбль, фальклорны інструментальны ансамбль, індывідуальныя выканаўцы (народная проза, сольныя спевы, дуэты, інструментальная творчасць), фальклорны танцавальны калектыў. Чакаем усіх на свята!

— У Капылі сёлета пройдзе Дзень беларускага пісьменства, а ўжо 5 верасня эстафету на правядзенне гэтага свята ў наступным годзе прыме Добруш. Як рыхтуецца горад да будучай урачыстасці?

Алена Раздуева, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Добрушскага райвыканкама:

— Хаця да правядзення Дня пісьменства ў нас яшчэ ёсць час, мы ўжо адрамантавалі Палац культуры, Дом культуры, бібліятэку. Правялі сапраўды вялікую працу. Цяпер ідзе конкурс эскізаў на выраб помніка нашаму земляку Івану Шамякіну, які плануецца ўсталяваць да Дня пісьменства. Таксама ў нашых жыхароў ёсць магчымасць самім паўдзельнічаць у арганізацыі свята, прапанаваўшы свае ідэі. Добруш — сапраўды годнае месца для правядзення Дня пісьменства, тут прыгожыя краявіды, прырода, яго называюць яшчэ "беларускай Венецыяй". Таму ў наступным годзе мы зробім усё магчымае, каб парадаваць мясцовых жыхароў і гасцей.

Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ

КУЛЬТУРА ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **адказны сакратар** — Ксенія ПАДОЛЬЦАВА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **агляднальнікі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ільля СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2021.
Наклад 2771. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 03.09.2021 у 18.00. Замова 2329.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

Адна сям'я ў адным ВНУ

Цуды здараюцца не толькі на Новы год ці Раство, але і першага верасня. Менавіта ў першы восеньскі дзень у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў прыступілі да вучобы, сярод многіх іншых навучэнцаў, тры адметныя першакурснікі — Аляксандр Фёдаравіч і Кацярына Міхайлаўна Раньшавы, а таксама іх старэйшая дачка Дар'я.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Натуральна, усе тры члены адной сям'і будуць вучыцца на розных факультэтах і на розных спецыяльнасцях. Так, сямейная пара плануе атрымліваць вышэйшую адукацыю на факультэце завочнага навучання па спецыяльнасці "Народная творчасць (народныя рамёствы)", а іх дачка — на дзённым аддзяленні на факультэце культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці па спецыяльнасці "Сацыяльна-культурная дзейнасць". Варта дадаць, што ўсе трое першакурснікаў паступілі не на платнае, а менавіта на бюджэтнае навучанне.

Дарэчы, у Наваполацку, дзе пражывае сям'я Раньшавых, пра будучае паступленне бацькоў і дачкі ў адну ВНУ ніхто не ведаў.

— Мы нікому не казалі пра тое, што разам з дачкой збіраемся сёлета паступаць у БДУКМ, вырашылі захаваць таямніцу, — адзначыў "К" Аляксандр Раньшаў. — Але цяпер, пасля залічэння ва ўніверсітэт, нас віншуюць усе, прычым і сябры, і суседзі, і знаёмыя на працы. Што і казаць, гэта вельмі прыемна!

Аляксандр і Кацярына Раньшавы са сферай культуры звязаны, да слова, не першы год — яшчэ ў далёкім 2000 годзе яны скончылі Віцебскае вучылішча мастацтваў па спецыяльнасці "Жывапіс". І вось ужо каля 15 гадоў займаюцца дызайнам мэблі і інтэр'еру, працуючы на прадпрыемстве "Мастак-Сэрвіс" у Наваполацку.

— Так склалася сітуацыя, што атрымаць вышэйшую адукацыю па розных прычынах нам, бацькам, не ўдалося, але гэта было нашай даўняй марай, — кажа Аляксандр Раньшаў. — Мы разам з дачкой сёлета наведалі "Дзень адчыненых дзвярэй у БДУКМ", дзе і пачулі пра кафедру народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тады Дар'я, якая хацела навучацца на спецыяльнасці "Сацыяльна-культурная дзейнасць", і прапанавала паспрабаваць паступаць ва ўніверсітэт усім разам, што мы, уласна кажучы, і зрабілі.

Па словах Аляксандра Раньшава, і яму, і жонцы пастаянна хочацца ствараць што-небудзь сваімі рукамі, а дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, народныя рамёствы — гэта менавіта той від дзейнасці, які вельмі блізкі ім і дапамагае раскрыць у поўнай меры ўласны творчы патэнцыял.

Што ж, як кажуць, вучыцца ніколі не позна, нават у сталым узросце. А калі яшчэ ад паспяховай вучобы залежыць здзяйсненне тваёй даўняй мары, дык навучанне робіцца нашмат лягчэйшым і цікавейшым.

Дарэчы, Кацярына Міхайлаўна ў вольны ад працы час робіць роспіс адзення, а таксама вядзе свой блог у сацыяльных сетках. Ёсць сваё хобі і ў Аляксандра Фёдаравіча, які, акрамя дызайну, займаецца жывапісам і мае ў сваёй мастацкай калекцыі ўжо дзясяткі ўласна зробленых карцін. Так што творчыя памкненні гэтых двух таленавітых людзей здаўна ўвасабляюцца ў рэальнасці. І, што вельмі верагодна і зразумела, робяцца прыкладам для іх дзяцей.

Да слова, як паведамляецца на сайце БДУКМ, сям'я Раньшавых падчас правядзення ўступных выпрабаванняў выглядала проста бліскуча. Кожны з членаў сям'і прадэманстраваў глыбокія веды праграмнага матэрыялу, а таксама дасканала выканаў экзаменацыйныя заданні на кожным з трох этапаў па дысцыпліне "Творчасць", выявіўшы грунтоўныя навыкі і ўменні ў дадзенай галіне творчай дзейнасці.

Рэктар універсітэта Наталля Карчэўская асабіста павіншавала ўсіх членаў творчай сям'і Раньшавых з паступленнем у БДУКМ і пажадала поспехаў у вучобе. Цяпер перад імі, як і перад сотнямі іншых першакурснікаў БДУКМ, адкрыты ўсе дарогі да навучання і да новых поспехаў у творчасці.

К

Суайчыннікі

З удзячнасцю да Беларусі

Жанна Раманоўская, кіраўніца Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры, старшыня Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым", рэдактар сайта і газеты "Уздым" адказвае на пытанні "К".

— Некалькі слоў пра вашу супольнасць, яе гісторыю, колькасць удзельнікаў, самыя цікавыя праекты, рэалізаваныя вамі.

— Таму ў нацыянальнай супольнасці Даўгаўпілса беларусы здаўна складалі 7-8%, з'яўляючыся чацвёртай этнічнай групай пасля рускіх, латышоў і палякаў.

У 1990-я гады, пасля развалу СССР, перасяленцы з Беларусі апынуліся за мяжой, сталі беларусамі замежжа. Гэта быў цяжкі час разгубленасці, неўладкаванасці, крызісу этнічнай і нацыянальнай ідэнтычнасці... Таму, калі латвійскае заканадаўства стала спрыяць стварэнню нацыянальна-культурных грамадскіх арганізацый, беларуская інтэлігенцыя зарэгістравала культурна-асветніцкае таварыства "Уздым".

Тады ж, у 1990-я гады, кіраўніцтва Даўгаўпілса прыняло дальнабачнае этнапалітычнае рашэнне — адкрыла муніцыпальныя культурныя цэнтры найбуйнейшых нацыянальных груп горада. Так, у Даўгаўпілсе пачалі працаваць Цэнтр рускай культуры, Цэнтр латышскай культуры, Цэнтр польскай культуры і Цэнтр беларускай культуры. Гэта бюджэтныя ўстановы самакіравання, якое фінансуе іх офісы і дзейнасць. Я не ведаю больш такіх прыкладаў у свеце.

Таварыства "Уздым" — грамадская арганізацыя, Цэнтр беларускай культуры — дзяржаўная ўстанова; гэта дзве асобныя юрыдычныя структуры, але з самага пачатку яны цесна звязаныя, працуюць разам, і пабочныя людзі нават не бачаць розніцы.

Таварыства "Уздым" знаходзіцца ў Цэнтры беларускай культуры (далей — ЦБК). Суполка з'яўляецца самай вялікай у Латвіі — 178 членаў (без уліку дзяцей нядзельнай школы). У асноўным гэта людзі старэйшага ўзросту, якія ў савецкі час перасяліліся ў Латвію. Далучаюцца да таварыства і маладыя жанчыны, якія выйшлі замуж у Латвію. А вось аўтахтонныя беларусы (мясцовыя, грамадзяне Латвіі па нараджэнні) у суполкі не прыходзяць, але нашы канцэрты наведваюць. Таксама чамусьці не далучаюцца і сучасныя гастарбайтары з Беларусі. Членамі таварыства з'яўляюцца не толькі беларусы па нацыянальнасці, але ўсе выхадцы з Беларусі — рускія, палякі, іншыя.

Творчыя людзі "Уздыму" займаюцца ў калектывах ЦБК — гурт беларускай народнай песні "Купалінка", тэатральная студыя "Паўлінка", танцавальны ансамбль "Лянок", харавая капэла "Спадчына", вакальны ансамбль "Пралескі", а іх дзеці і ўнукі — у дзіцячай студыі "Скарбніца". Але калектывы адкрытыя для ўсіх жыхароў Даўгаўпілса, каму цікавая беларуская культура.

Творчыя беларускія калектывы часта выступаюць на святах Даўгаўпілса, навакольных пасёлкаў і гарадоў, на канцэртах іншых нацыянальна-культурных таварыстваў, на святах беларускіх суполак Прыбалтыкі, на фестывалях у Беларусі. Абавязкова ўдзельнічаюць у Латвійскім свяце песні і танца (гэта культурная алімпіяда латышоў), у Фестывалі нацыянальных культур, што з'яўляецца гонарам.

Штогадовымі культурнымі праектамі беларусаў у Даўгаўпілсе можна назваць наступныя: вясновыя і восеньскія Дні беларускай культуры, Міжнародны фестываль народнай культуры "Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе", народнае свята "Беларускае Купалле", Міжнародная канферэнцыя "Беларускія чытанні", Міжнародны фестываль беларускай аўтарскай песні, святы першага і апошняга званка ў нядзельнай школе, Свята беларускай кухні. Акрамя гэтых мерапрыемстваў, якія ладзяцца на гарадскім узроўні, ёсць цэлы шэраг выстаў, імпрэз, літаратурных вечароў, сустрэч, прэзентацый, урокаў, дабрачынных акцый, супольных вячорак і шмат усяго цікавага, што адбываецца кожны тыдзень. Беларусы Даўгаўпілса не існуюць адасоблена, а адкрытыя для іншых народаў і культур, таму з задавальненнем праводзяць экскурсіі па Беларускім цэнтры на мове госця — беларускай, рускай, латышскай, значна радзей англійскай.

Мы шмат увагі надаём камунікацыям, каб пра нашу дзейнасць і справы людзі ведалі, маглі прыйсці на мерапрыемства, далучыцца да таварыства. Так, таварыства "Уздым" выдае друкаваную газету "Уздым" на беларускай мове, вядзе сайт на беларускай і рускай мовах, старонкі ў Фэйсбуку і Інстаграме. У ЦБК таксама ёсць свой сайт — на латышскай, беларускай і рускай мовах, акаўнты ў Фэйсбуку і Інстаграме.

Працяг на ст. 13

Апошнія штрыхі да параднага партрэта

Заканчэнне. Пачатак на ст. 1.

Капыль маладзейшы за Полацк, які з'яўляецца калыскай нашай дзяржаўнасці, але старэйшы за сучасную сталіцу краіны — Мінск. Як і ў большасці гарадоў Беларусі, што перажылі ваеннае ліхалецце і сумніўныя сацыяльныя эксперыменты, у Капылі мала што захавалася ад спадчыны мінулых стагоддзяў.

Паводле вонкавага аблічча гэта збольшага тыповы савецкі райцэнтр са стандартнай забудовай і ўласнымі сядзібамі побач з цэнтрам.

Свята пісьменства паспрыяла добраўпарадкаванню горада. На ходніках пакладзена новая плітка. На праезджай частцы — новы асфальт. На час свята парк упрыгожаны арыгінальнымі прасторавымі кампазіцыямі. А яшчэ ў горада з'явіўся новы помнік. Гэта скульптурная выява рамесніка з партрэтнымі рысамі Цішкі Гартнага. На думку аўтара помніка Паўла Вайніцкага, такая вольная інтэрпрэтацыя вобраза слыннага літаратара дае магчымасць п\радставіць яго адначасова ў некалькіх іпастасях, важных для разумення ягонай творчасці і варункаў лёсу.

На момант візіту ў Капыль нашага карэспандэнта ў парадны партрэт горада ўносіліся апошнія штрыхі...

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, наш кар.
Мінск — Капыль — Мінск.

Уратаваць і не нашкодзіць

Выяўленне, захаванне і папулярызацыя нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей даўно зрабіліся важным кірункам дзейнасці ў айчыннай галіне аховы спадчыны. Сёння стаўка ў прамоцыі гістарычнага набытку Беларусі ў свеце робіцца акурат на жывыя традыцыі, якія не маюць аналагаў у іншых народаў альбо захаваліся ў нашай краіне ў найбольш аўтэнтычным выглядзе. З якімі выклікамі і рызыкамі сутыкаюцца жывыя спадчына Беларусі і яе захавальнікі?

Антон РУДАК

Грунтоўная прэзентацыя беларускіх традыцый ва ўсім свеце немагчымая без плённай дзейнасці, якая мусіць пачынацца ўнутры краіны яшчэ на рэгіянальным узроўні. Каб данесці да супрацоўнікаў на месцах усе асаблівасці працы з традыцыямі і іх носьбітамі, рэгулярна ладзяцца сустрэчы, на якіх спецыялісты з усёй краіны могуць падзяліцца досведам сваёй работы ў гэтай галіне і атрымаць каштоўныя парады. 26 жніўня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбыўся штогадовы рэспубліканскі навукова-практычны семінар, прысвечаны аналізу эфектыўнасці выканання канвенцыі UNESCO аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў межах падрыхтоўкі чарговай перыядычнай нацыянальнай справаздачы.

Як адзначыла начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля Хвір, колькасць нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, унесеных у Дзяржаўны спіс, імкліва павялічваецца, сёння іх налічваецца ўжо сто пяцьдзясят пяць. Расце прадстаўніцтва Беларусі і ў спісах UNESCO — у Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва ўключаныя такія элементы, як Будслаўскі фэст і культура лясного бортніцтва, а ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая патрабуе тэрміновай аховы, — абрады "Калядныя цары" і "Юраўскі карагод". Асаблівая адказнасць за захаванне нематэрыяльных культурных каштоўнасцей кладзецца на рэгіёны, у якіх існуюць гэтыя праявы нацыянальнай культуры.

ДВА СПІСЫ, ДВА ЛЁСЫ

Дырэктар фонду «Культурная спадчына і сучаснасць», член Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па пытаннях UNESCO Ала Сташкевіч распавяла аб ажыццяўленні праграмы падтрымкі супольнасці носьбітаў вясновага абраду "Юраўскі карагод" у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Гэты элемент у 2019 годзе ўвайшоў у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO, якой патрабуецца тэрміновая ахова.

Як падкрэсліла дакладчыца, менавіта гэты спіс з'яўляецца галоўным інструментам аховы нематэрыяльнай спадчыны, бо ў яго ўваходзяць, як правіла, элементы, якія маюць вельмі канкрэтныя лакацыі, распаўсюджаныя ў невялікіх супольнасцях. Ахова такіх праяў нематэрыяльнай спадчыны забяспечваецца шэрагам дакументаў — акрамя Усеагульнай дэкларацыі аб культурнай разнастайнасці, гэта таксама і Нагойскі пратакол аб абароне правоў носьбітаў генетычных рэсурсаў і традыцыйных ведаў і практык, і Канвенцыя аб біяразнастайнасці, у якой згадваецца аб існаванні традыцыйных ведаў і практык, звязаных з генетычнымі рэсурсамі, пад якімі разумеецца сукупнасць усіх жывых арганізмаў. Такім чынам, з генетычнымі рэсурсамі звязаныя такія традыцыйныя практыкі, як бортніцтва, траўніцтва, рыбалоўства і г.д.

Другі па важнасці інструмент — Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. У яго ўваходзяць, як правіла, тыя элементы, якім знікненне пагражае не ў гэткай ступені і якія маюць больш шырокае распаўсюджанне, нават на ўзроўні ўсёй краіны. Такія элементы часта робяцца нацыянальнымі брэндамі — як прыклады ў нашых умовах можна згадаць традыцыі саломапляцення альбо выцінанкі. Тым не менш такое маштабнае брэндзіраванне часам пагражае захаванню лакальных адметнасцей — калі ўніфікаваная традыцыя зберагаецца на агульнанацыянальным узроўні, але разам з тым губляюцца яе мясцовыя асаблівасці.

Фота Антона РУДАКА

Удзельнікі семінара мелі магчымасць агледзець новую экспазіцыю, прысвечаную традыцыйным беларускім музычным інструментам.

ЮРАЎСКАМУ ФЕСТЫВАЛЮ БЫЦЬ?

Абрад "Юраўскі карагод" з'яўляецца адной з першых праяў нематэрыяльнай спадчыны, што былі ўключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Цікава, што аналагічныя абрады ёсць у Македоніі, Славакіі, Сербіі і нават у лужыцкіх сербаў — славян, якія жывуць у Германіі ў ваколіцах Дрэздэна. Тым не менш з усіх славянскіх краін менавіта ў Беларусі захаваўся найбольш архаічны варыянт гэтага абраду.

Для распрацоўкі эфектыўнай стратэгіі захавання элементу быў даследаваны рэгіён, у якім распаўсюджаны абрад, вывучаны патэнцыял развіцця, з мэтай вырашэння цэлага шэрага праблем, з якімі сутыкаецца супольнасць носьбітаў традыцыі, — экалагічных, дэмаграфічных, працаўладкавання моладзі. З мэтай інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ужо адбылася сумесная экспедыцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Нацыянальнай акадэміі навук, вынікі якой цяпер апрацоўваюцца і ўжо сведчаць аб выдатным патэнцыяле даследаванага рэгіёна.

На наступны год тут запланаваная дзейнасць Летняй студэнцкай школы, што дазволіць актыўна ўключыць моладзь у дзейнасць па захаванні мясцовых традыцый. Для папулярызацыі "Юраўскага карагода" на 2022 год таксама плануецца правядзенне ў вёсцы Пагост фестывалю нематэрыяльнай культурнай спадчыны, мяркуецца, што туды будуць запрошаныя для ўдзелу прадстаўнікі іншых славянскіх народаў, якія таксама маюць свае адметныя традыцыі святкавання дня святога Юрыя.

Фота ich.unesco.org

Абрад "Юраўскі карагод" у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

ВІРТУАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

Галоўны бібліятэкар навукова-метадычнага аддзела Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага Кацярына Барысюк распавяла аб папулярызацыі творчасці народных мастакоў на прыкладзе стварэння электроннага рэсурсу «Іван Супрунчык. Ад слова да дрэва». У 2020 годзе ў рамках адзначэння Года малой радзімы Брэсцкая абласная бібліятэка і ўпраўленне культуры Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ініцыявалі правядзенне конкурсу па стварэнні віртуальных праектаў краязнаўчага напрамку, на якім Столінская цэнтральная раённая бібліятэка прадставіла згаданы электронны інфармацыйна-краязнаўчы рэсурс, прысвечаны спадчыне народнага майстра і славутага разьбяра, бібліятэкара і этнографа.

Майстар працуе ў такіх відах выяўленчага мастацтва, як станковая ды манументальна-дэкаратыўная скульптура і графіка. Электронны рэсурс, прысвечаны творчасці Івана Супрунчыка, змяшчае яго біяграфічныя звесткі, этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя ім, бібліяграфію, фотаздымкі, аўдыя- і відэаматэрыялы, а таксама гісторыю Цэнтра драўлянай скульптуры ў вёсцы Цераблічы Столінскага раёна, які ўзначальвае разьбяр. Азнаёміцца з рэсурсам можна на сайце Брэсцкай абласной бібліятэкі. Сёння аддзелам культуры Столінскага раённага выканаўчага камітэта вядзецца работа па ўключэнні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны элемента "Творчасць Івана Піліпавіча Супрунчыка". Пэўнай праблемай, аднак, застаецца адсутнасць забеспячэння ў гэтым выпадку пераемнасці, бо майстар не мае паслядоўнікаў, якія пераняслі б яго ўменні.

ЗНАЙСЦІ БАЛАНС

У сферы захавання нематэрыяльнай спадчыны яшчэ застаецца багата актуальных пытанняў, вырашэнне якія патрабуе грунтоўнай працы. Неабходнае павышэнне дасведчанасці ўдзельнікаў мясцовых супольнасцей аб традыцыях, якія існуюць у месцы іх жыхарства, забеспячэнне пераемнасці традыцыйных уменняў і навыкаў, заахвочванне моладзі да ўключэння ў справу зберажэння жывой спадчыны.

Устойліваму развіццю і захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у мясцінах іх бытавання можа істотна спрыяць выкарыстанне турыстычнага патэнцыялу — але пры ўмове, што сродкамі, накіраванымі на падтрыманне той ці іншай традыцыі, мусяць карыстацца менавіта іх носьбіты і захавальнікі, удзельнікі мясцовых супольнасцей. Разам з тым варта памятаць і аб рызыках, якія можа несці папулярызацыя жывой спадчыны, і пазбягаць яе фальклярызацыі, камерцыялізацыі ды брэндзіравання. Нематэрыяльная спадчына патрабуе далікатнага стаўлення, і захаваць яе магчыма адно супольнымі намаганнямі не толькі носьбітаў альбо работнікаў сферы культуры, адукацыі ці сродкаў масавай інфармацыі, але высілкамі ўсяго грамадства.

К

Днямі ў выдавецтве "Беларуская навука" выходзіць новая кніга доктара мастацтвазнаўства, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вольгі Лабачэўскай — аўтара, якая летась стала лаўрэатам Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва ў намінацыі "мастацтвазнаўства і крытыка" за кнігу, прысвечаную беларускім традыцыям саломапляцення. Увогуле, імя Вольгі Лабачэўскай сярод тых, каго цікавіць беларуская традыцыйная культура, добра вядомае. І гаворка не толькі пра навукоўцаў ці супрацоўнікаў музеяў — калі можна казаць пра бестселеры ў гэтай галіне, то іх аўтар менавіта Вольга Лабачэўская: яе кнігі чытаюць і вывучаюць шырокія колы аматараў беларускай спадчыны, цікавасць да якой у апошнія дзесяцігоддзі моцна ўзрасла. Можна прадказаць, што падобны лёс чакае і новую кнігу — "Беларускія посцілкі і дываны. Антрапалогія і мастацтва традыцыйнай рэчы".

Надзея КУДРЭЙКА

— Новая кніга, пра якую мы сёння гаворым, у вас далёка не першая. А колькі кніг увогуле вы напісалі?

— Цяжка сказаць дакладна, нават не лічыла: ёсць і сур'ёзныя манаграфіі, ёсць з большым ухілам у практыку. З папулярных можна згадаць "Беларускі народны касцюм. Крой, вышыўка і дэкаратыўныя швы" 2009 года — у яе было два перавыданні. Гэтая кніга ў немалой ступені і паспрыяла таму, што цікавасць да беларускіх строяў так узрасла, — людзі атрымалі магчымасць навучыцца самі іх шыць. Ці "Повязь часоў — беларускі ручнік" 2002 года — яна таксама перавыдавалася, таксама вельмі запатрабаваная: там паказана ўнікальнасць і разнастайнасць беларускіх ручнікоў, тое, наколькі моцна ў іх адлюстроўваюцца гістарычныя і культурныя традыцыі розных рэгіёнаў Беларусі. Памятаю, калі кніга выйшла, украінскія калегі вельмі зайздросцілі, казалі — а ў нас і столькі ручнікоў няма, і альбома такога выдатнага няма! З параўнальна нядаўніх была даволі гучная работа — "Мастацтва дзеля славы Божай. Саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы" — за гэтую кнігу я атрымала Нацыянальную прэмію у галіне выяўленчага мастацтва. Па саломцы я пісала кандыдацкую дысертацыю, а вось ужо доктарскую прысвяціла беларускаму традыцыйнаму тэкстылю. І напісаўшы спачатку пра ручнік, пасля пра касцюм, лагічна было звярнуць увагу і на посцілку, якая ўвагай даследчыкаў крыху абдзеленая.

— А чаму так сталася, што на посцілкі звярталі мала ўвагі?

— Бо па сутнасці гэта такія звычайныя рэчы, побытавыя. Яшчэ і сёння яны ёсць амаль у кожнай хаце, але іх ужо практычна не вырабляюць — акрамя прафесіяналаў з Дамоў рамёстваў, напрыклад. А выдання сур'ёзнага, з вялікім ілюстратыўным матэрыялам, і не было. Пры тым што посцілкі — гэта такая невычарпальная скарбніца творчасці:

Антрапалогія беларускай посцілкі

Што практычна не прадстаўлена ў музеях?

з мноствам тэхнік, узораў, арнаментаў, спалучэнняў колераў, разнастайных кампазіцыйных прыёмаў... Мастацтвазнаўцу тут ёсць што вывучаць, а чалавеку, які любіць мастацтва, ёсць чым захапляцца. Мой падыход увогуле адрозніваецца ад чыста этнаграфічнага. Я мастацтвазнаўца — і па адукацыі, і па погляду на рэчы, і па прафесійным падыходзе. Народнае мастацтва я разглядаю менавіта як мастацтва, а не толькі як частку традыцыйнай культуры: у першую чаргу мяне прываблiваюць сапраўды мастацкія рэчы. У Ленінградзе ў Акадэміі мастацтваў я вучылася на ўзорах класічнага мастацтва, але лічу, што ўзоры народнага ім не саступаюць.

На жаль, калі даводзіцца сутыкацца з творчасцю нашых прафесійных мастакоў па тэкстылі, бачна, што яны гэтага матэрыялу не ведаюць. Можа, менавіта таму, што ён не быў яшчэ абагульнены, не быў прадстаўлены ў даступнай

> **На жаль, калі даводзіцца сутыкацца з творчасцю нашых прафесійных мастакоў па тэкстылі, бачна, што яны гэтага матэрыялу не ведаюць.**

для ўсіх форме, — да музейных сховішчаў, дзе посцілкі проста стоясамі ляжаць адна на адной, не ў многіх ёсць магчымасць дабрацца. На мой погляд, ад мастакоў гэтая тэма зараз патрабуе асэнсавання і перакладу на сучасную мову дэкаратыўнага мастацтва. Спадзяюся, кніга таму паспрыяе — у ёй, акрамя тэксту, змешчана і каля паўтысячы фотаздымкаў, добрая частка з якіх зроблена менавіта так, каб можна было разгледзець нават дэталі ткацтва і ўзораў. Гэта вельмі цікавая з'ява, якая, нягледзячы на розныя запазычанні, безумоўна, нясе на сабе нацыянальны адбітак і пры гэтым мае многа цікавага з пункту гледжання агульнамастацкіх каштоўнасцей.

— У назве кнігі вы аб'ядноўваеце посцілкі і дываны. І яшчэ адно слова прыцягвае ўвагу — "антрапалогія". Мабыць, трэба патлумачыць.

— Дыванамі ў вёсках прынята было называць самыя лепшыя посцілкі, самыя прыгожыя, самыя святочныя — не радзюжкі, не радно, не дзяружкі... Дываны часта ткаліся не толькі з ільну — у іх дадавалася і воўна, і тады атрымлівалася ўжо значна даражэй. Але посцілкі і дываны — з'ява адна і тая ж. На яе мне хацелася паглядзець з не зусім стандартнага ракурсу. Антрапалогія — гэта даследаванне чалавека, а ў дадзеным выпадку — гэта даследаванне рэчы ў кантэксце яе ўжывання, стварэння і выкарыстання чалавекам. У ёй маглі траву насіць, а маглі накрыць ёю каня, выкарыстаць як коўдру, пазней — заслаць сядзенне аўтамабіля... Апошнім часам пачалі ўсплываць здымкі недзе з 50-х гадоў мінулага стагоддзя — сямейныя фота на фоне посцілкі. І гэта шмат кажа пра тое, чым для людзей была посцілка: самай прыгожай рэччу ў доме, якую выносілі для такой значнай і рэдкай па тым часе для вяскоўцаў справы — сямейнага фота. Гэтая "простая" рэч вылучала чалавека са штодзённасці, была часткай нейкага іншага, лепшага, святочнага жыцця.

Вось тады ў мяне і з'явілася думка паглядзець на тэму з пункту гледжання жыцця чалавека: посцілка як абавязковы атрыбут дзявочага пасагу — на захадзе Беларусі дзяўчына перад вяселлем проста павінна была мець падвойны дыван; посцілка як мера багацця і дабрабыту; посцілка як магчымасць для жанчын займацца творчасцю, і г. д. Яшчэ такі цікавы момант — новае жыццё посцілак у гарадскім асяроддзі: бо для гараджан яны набываюць ужо іншы сэнс, менш утылітарны — у першую чаргу ўспрымаюцца як спадчына, як памяць. Посцілка ў выставачнай ці музейнай прасторы — яшчэ адна тэма.

— У вас у кнізе каля 500 самых разнастайных фота. Адкуль яны ўсе?

— Сабраць фота якраз і было самым складаным. Бо, напрыклад, калі мы рабілі кнігу пра ручнікі, ёй папярэднічала вялікая нацыянальная выстава "Беларускі ручнік" у Нацыянальным гістарычным музеі — з усёй краіны былі прывезеныя лепшыя ўзоры. З фатографам Георгіем Ліхтаровічам мы амаль два тыдні працавалі, не выходзячы з музея. Зараз такой магчымасці не было. Усё збіралася з розных крыніц — нешта з маіх уласных экспедыцый, некаторую колькасць добрых здымкаў далі — ці дазволілі зладзіць у сваіх сховішчах спецыяльную фотасесію — Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны гістарычны музей, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Дапамагло і Студэнцкае этнаграфічнае таварыства. Увогуле, посцілкі захоўваюцца ў самых розных музеях, але, як правіла, калекцыі гэтыя немагчыма прагледзець. Яны і не алічбаваныя. Для многіх посцілак з Нацыянальнага гістарычнага музея — а ён іх мае больш за чатыры сотні — у кнізе будзе проста "прэм'ера", дзякуючы фатографу Міхасю Аракчэеву.

— Ці можна падзяліць беларускія посцілкі па рэгіёнах? Я так разумею, мы гаворым менавіта пра вясковую традыцыю?

— Канешне, хацелася б паглядзець, што там ткалася на мануфактурах Тызенгаўза ў Гародні, якія дываны былі на мануфактуры Агінскага ў Карэлічах. Але такія рэчы амаль не дайшлі на нашага часу, а калі і дайшлі, то знаходзяцца за межамі Беларусі. У нас амаль што няма ўзораў XVIII—XIX стагоддзяў. Хаця, зразумела, што на гэтых мануфактурах і працавалі простыя сялянкі. Але тое, што прадстаўлена ў кнізе, гэта менавіта вясковае ткацтва, на звычайных вясковых кроснах.

Сапраўды, перада мной стаяла пытанне, як класіфікаваць матэрыял. Ручнікі можна было разбіваць па рэгіёнах і па лакальных варыянтах, але з посцілкамі такі падыход не працуе. Ручнікі — з'ява старажытная, а посцілкі развіліся досыць позна: датычна сялянскай традыцыі можна казаць пра другую палову XIX стагоддзя — калі пачаў змяняцца інтэр'ер, калі адыходзілі ў нябыт курныя хаты — без дымаходаў — і з'яўляліся чыстыя, калі пашыраўся асартымент рэчаў менавіта дэкаратыўных, святочных. Акрамя таго, развіццё посцілак на Беларусі шчыльна звязанае з развіццём тэхнікі ткацтва. У XVIII стагоддзі на нашу тэрыторыю пачалі прыходзіць традыцыі еўрапейскага ткацтва, і яны распаўсюджваліся па ўсёй тэрыторыі. І я вырашыла класіфікаваць посцілкі і дываны па назвах. Прычым да адной асноўнай, найбольш папулярнай назвы, я дадаю многа іншых, што ўжываліся ў розных мясцовасцях. Радзюжкі — самыя простыя, радугі — з вясёлкавымі колерамі: з'ява ў асноўным гродзенская. Назва "радуга" паходзіць ад рускага слова, але сустракаецца для іх і назва "тынчовік" ад польскага "тэнча". Падвойныя дываны найбольш характэрныя Гродзеншчыне і Заходняй Брэстчыне. Ёсць прыклады шматнітовага ткацтва з пераважна геаметрычнымі ўзорамі — дымкі, ёсць выцяганкі, перабіранкі, сейпакі, ёсць выкладанкі, у якіх можна выкласці любы ўзор якога хочаш колеру — што немагчыма зрабіць, напрыклад, у дымцы. Выкладанкі, дарэчы, гэта практычна апошні зрэз народнай традыцыі, іх пачалі ткаць пераважна ўжо пасля Другой сусветнай вайны — бо з'явіліся адпаведныя катушачныя ніткі: ірыс, мулінэ. У 70-я, 80-я ў ткачых яшчэ не было праблем з матэрыялам. А напрыканцы 80-х магчымасць набываць ніткі знікла, і на гэтых выбіранках народная традыцыя, можна сказаць, скончылася. З часам усё перайшло ў сферу культуры, у Дамы рамёстваў. І дзякуй богу, што маладыя майстры яшчэ паспелі навучыцца з першых рук — ад бабуль і маці.

— Як вы думаеце, каго найперш кніга павінна зацікавіць?

— Мне здаецца, не толькі спецыялістам, але і шырокаму колу чытачоў яна будзе цікавая. Паўтаруся, у ёй шмат яскравых фотаздымкаў. Адна з асноўных задач — паказаць багацце традыцыі нашым мастакам і творцам, і нагадаць музеям пра такую з'яву — бо, шчыра кажучы, у апошнія гадоў 20 ці нават 30 яны па сутнасці ўжо не збіраюць посцілкі, апошняя хваля развіцця гэтага мастацтва — 80-х гадоў — у музеях практычна не прадстаўлена. На сваёй старонцы ў Facebook я пачала выкладваць здымкі розных посцілак, і рэакцыя людзей нават сталася для мяне нечаканай — аказваецца, калі "звычайную" посцілку прадставіць у сеціве і падаць як твор мастацтва, яна выклікае буру эмоцый і захаплення. Я буду рада, калі мая кніга падштурхне людзей да асэнсавання гэтай рэчы менавіта як нашай культурнай спадчыны.

К

Беларускае кіно: не “кола”, а “дрэва”

Што не так з айчынным кінамастацтвам?

Рэканструяваны комплекс Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” прызначаны для здымак самых сучасных праектаў.

Бясконцае падарожжа па замкнёным коле. Так можна апісаць існаванне беларускага кіно апошніх трох дзесяцігоддзяў. Нягледзячы на гучныя словы і заявы, творчыя і, тым больш, камерцыйныя перамогі нашага кінематографа, за гэты час, можна пералічыць па пальцах адной рукі. Калі не прымаць у разлік дакументалістыку і анімацыю (аб гэтых напрамках кінамастацтва варта весці асобную размову), падстаў для гонару ў беларускіх кінематаграфістаў зусім не шмат.

Адна з безумоўных — студыйны комплекс Нацыянальнай кінастудыі. Нават на фоне самых дасканалых студый у іншых краінах павільёны і натурная пляцоўка «Беларусьфільма» ўражваюць — тут можна ствараць самае сучаснае кіно. Што рэгулярна і адбываецца: нягледзячы на розныя, часта не звязаныя з творчым працэсам, цяжкасці, замежныя кінематаграфісты пастаянна здымаюць тут стужкі. І не толькі тут: наша краіна стабільна прыцягвае да сябе здымачныя групы з іншых дзяржаў. У нас ствараюць як поўнаметражныя фільмы, так і серыялы. Попытам карыстаецца не толькі беларуская прырода, павільёны, тэхніка і касцюмы ў антуражы Другой сусветнай вайны. Запатрабаваныя нашы спецыялісты, члены здымачных груп, адпаведнае абсталяванне. Безумоўна, у Беларусі існуе даволі салідная інфраструктура для паўнавартаснай кінаіндустрыі. І «Беларусьфільмам» яна не вычэрпваецца: працуе шэраг прыватных кінакампаній, якія вырабляюць розную прадукцыю для замежных заказчыкаў, прадстаўляюць у арэнду тэхніку і абсталяванне.

Парадаксальна, але ўсё гэта не дапамагае роскві ту ўласна беларускага кінамастацтва. Нават цалкам спрыяльнае заканадаўства, падатковыя ільготы, больш за тое, фінансавыя датацыі і непасрэднае фінансаванне кінапраектаў ў выглядзе дзяржзакупак кінастужак Міністэрствам культуры не ў стане зрабіць нашы фільмы прывабнымі ў вачах хоць бы ўласнага гледача.

ЧАГОСЬЦІ НЕ ХАПАЕ?..

Дык чаго ж усё-такі не хапае беларускаму кіно?

Вядома, кіно — гэта сума многіх складнікаў. І грошы ў ім адыгрываюць вельмі важную, аднак, не вызначальную ролю. Існуе нямала прыкладаў, калі велізарныя ўкладанні ніяк не спрыялі творчай удачы. Бюджэты ў фільмаў той жа Нацыянальнай кінастудыі складана назваць гіганцкімі. Але гісторыя кіно мае шмат прыкладаў, калі таленавіныя і паспяховыя стужкі рабіліся і за куды меншыя грошы. Вядома, існуе праславутая праблема, калі значная частка сродкаў на «Беларусьфільме» ідзе не непасрэдна на кінавытворчасць, а на ўтрыманне гіганцкага кінакомплекса і пакрыццё даўгоў. Але нават астатняй часткай, безумоўна, можна распараджацца нашмат больш карысна і прагматычна.

Згодна з ужо некалькімі канцэпцыямі развіцця нацыянальнай кінематаграфіі, адной з галоўных задач у нашым кіно з'яўляецца стварэнне паўнавартаснага канкурэнтнага асяроддзя. Логіка простая: чым больш у краіне кінавытворцаў, тым лепш, і колькасць абавязкова перарасце ў якасць. Вось толькі неабходнай колькасці пакуль не назіраецца.

У апошні час адразу некалькі кінапраектаў па замове Міністэрства культуры здымаюць прыватныя кінакампаніі. Іх прэм'еры пакуль наперадзе і пра вынік казаць рана. Ды і фінансуе наша дзяржава прыватных прадзюсараў усё апошняе дзесяцігоддзе, на жаль, пакуль без належнай паўнавартаснай аддачы. Нярэдка аказваецца, што «прадзюсары», у тым ліку, замежных проста прысмоктваюцца да дзяржаўных грошай, прапаноўваючы пры гэтым малацікавыя і слабыя ў творчым і камерцыйным рэчышчы праекты. У нашай краіне праекты фінансуюцца шляхам правядзення адкрытых конкурсаў на вытворчасць фільмаў праз дзяржзакупкі. Але выбіраць на дадзеных конкурсах часцей за ўсё няма з чаго і з каго — Нацыянальная кінастудыя таксама не ў стане прапанаваць годныя варыянты. У апошнія час некалькі конкурсаў прыйшлося і зусім адмяніць (ці не з-за адсутнасці годных варыянтаў?). Тое ж можна сказаць у дачыненні да творчых конкурсаў на сцэнарый або сінопсіс — вялікая частка пададзенага матэрыялу хутчэй бліжэй да графаманства, чым да прафесійнай сцэнарнай працы.

“Аванцюры Пранціша Вырвіча” (2019) — фільм па прозе сучаснай беларускай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай.

Самым паспяховым фільмам апошніх дзесяцігоддзяў стала ваенная драма Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га." (2000).

“Масакра” — адзін з самых знакамітых фільмаў Нацыянальнай кінастудыі за апошнія гады (рэж.А.Кудзіненка, 2010 г.)

Стужка Уладзіміра Котта “Брэсцкая крэпасць” (2010) — удалы прыклад супрацоўніцтва беларускіх кінематаграфістаў з расійскімі калегамі.

“Вой, ма-ма-чкі!..” (2012–2018) Івана Паўлава — прыклад сучаснай серыяльнай прадукцыі Нацыянальнай кінастудыі.

Сюжэты пераважнай большасці сцэнарыяў, якія прыходзяць на конкурсы і Нацыянальную кінастудыю, вельмі прымітыўныя і другасныя. Сцэнарная праблема, так ці інакш, характэрная для большасці кінематаграфій свету. У Беларусі яна носіць асабліва востры характар — для прафесіяналаў сцэнарнага рамяства значна больш выгадна працаваць на рускамоўныя рынкі суседніх краін. Тое ж самае тычыцца і іншых творчых кадраў — ад рэжысёраў да акцёраў.

ХТО ГАЛОЎНЫ Ў КІНО

Тое, што ў кіно галоўнае — людзі, і што яны важней за грошы, даказваць нікому не трэба. Гэта датычыцца і аўтараў з арыгінальным, таленавітым падыходам да тэмаў і сюжэтаў, і прафесіяналаў вузкіх кінематаграфічных спецыяльнасцяў, і менеджменту, тых самых прадзюсараў, кіраўнікоў кінастудый і падраздзяленняў. Беларусь ніколі не была пакрыўджаная таленавітымі людзьмі. Больш за тое, менавіта інтэлектуальны рэсурс вызначае поспех у свеце постіндустрыяльнай эканомікі. Вось толькі ідуць зараз нашы патэнцыйныя кінематаграфісты не на факультэт экранных мастацтваў БДАМ і не ў аддзел кадраў «Беларусьфільма», а ў сферу IT-тэхналогій, якая імкліва развіваецца, у сумежную кіно індустрыю камп'ютарных гульняў або вострактуальны відэаблогінг.

Вядома, трапляюць і ў кіно, яно па-ранейшаму прыцягальна для новага пакалення. Шмат таленавітай моладзі ідзе вучыцца ў прыватныя кінашколы (і самі гэтыя кінашколы адкрываюць), працаваць у прыватныя прадакшэны, займаюцца здымкамі рэкламы і абслугоўваннем замежных кінагруп. Спрабуюць здымаць і сваё кіно, балазе, лічбавая эпоха значна пашырыла тэхнічныя магчымасці для малабюджэтнай вытворчасці. Але вось толькі без значных рэсурсаў, інтэлектуальнай базы, паўнавартаснай інфраструктуры кінаіндустрыі, сучасных падыходаў да прадзюсіравання канкурыраваць на сусветным кінарынку такой саматужнай, па сутнасці, вытворчасці практычна немагчыма.

Часы мяняюцца, і пакуль сфера нашага кіно на чале з Нацыянальнай кінастудыяй галоўным чынам была занята тым, як эфектыўней размеркаваць ды засвоіць дзяржаўныя сродкі, парадак дня сталі вызначаць стрымінгавыя сэрвісы, якія разлічаны, пераважна, на малы экран. Так званая «нэтфлікс-рэвалюцыя» дазволіла прадзюсарам у развітых краінах менш залежаць ад дзяржавы і кінафондаў. Выбар крыніц фінансавання цяпер стаў шырэй, а магчымасцяў для выхаду да шырокага гледача, у тым ліку замежнага, больш.

Глабальныя перамены апошняга дзесяцігоддзя дораць нашаму кіно яшчэ адзін шанец заняць сваё месца сярод кінематаграфій свету. Але каб заняць гэтае месца, наша кіно павінна мець арыгінальныя рысы, свае прыёмы і тэмы, якія дазволяць лёгка адрозніваць айчынныя фільмы ад фільмаў суседзяў. Так ці інакш, стварэнню нацыянальнага кінематографа для нашай краіны альтэрнатывы ўсё роўна не існуе.

Зразумела, «нацыянальны» ў дадзеным выпадку не азначае замкнёны на самім сабе, ізаляцыя ў кіно ніколі і нікому не прыносіла карысці. Але для таго, каб стаць прывабнымі для іншых, трэба пачаць здымаць для саміх сябе. Кінуць пераможваць старыя тэмы, бясконца настальгіраваць па часах «Бураціна» і «Чырвонага Каптурыка», павярнуцца да актуальных тэм ды твораў нацыянальнай літаратуры.

Нацыянальны кінематограф — гэта дрэва, якое немагчыма даглядаць без належных сучасных ведаў і прафесійных падыходаў. Ён патрабуе ўважлівага і чулага садоўніка, які добра разумее, што папярадзе збору пладоў ідзе карпатлівая селекцыйная праца, праполка ад пустазелля і абарона ад паразітаў. Наш галоўны рэсурс — творчы, і губляць яго азначае забяспечыць адставанне сферы беларускага кінамастацтва яшчэ на дзесяцігоддзі.

Віктар СЕРГІЕВІЧ

8 верасня Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі адкрые сезон "Дзікім паляваннем караля Стаха". Прэм'ерай гэтага спектакля ў сярэдзіне ліпеня завяршаўся мінулы творчы марафон калектыва. Опера Уладзіміра Солтана стала злучальнай ніткай не толькі між двума сезонамі, але і між рознымі эпохамі.

Надзея БУНЦЭВІЧ /
Фота Таццяны
МАТУСЕВІЧ

"...Паляванне"? На мастацкія адкрыцці

Ёсць нейкая магія лічбаў у тым, што 89-ы сезон адкрываецца операй, напісанай і ўпершыню пастаўленай у 89-м — у часы савецкай перабудовы, можна сказаць, на досвітку далейшай Незалежнасці краіны. Той спектакль, пратрымаўшыся ў рэпертуары каля чвэрці стагоддзя, стаў "лідарам пракату" сярод беларускіх опер усіх часоў. Але цяперашняя прэм'ера — не проста новая версія сцэнічнага прачытання вядомай партытуры. Гэта яшчэ і шмат у чым новая музыка!

Уладзімір Солтан трагічна загінуў у 1997-м, але рэжысёр Ганна Маторная і дырыжор Андрэй Іваноў звязаліся з нашчадкамі, каб аднавіць некаторыя нявыкарыстаныя раней фрагменты. Справа ў тым, што творы, патрапіўшы ў тэатр, звычайна рэдагуюцца ў адпаведнасці з пастаноўчай задумай. А гэта опера і ўвогуле, можна сказаць, стваралася калектыўна — прыблізна так, як часцяком рабілася ў савецкіх тэатрах з 1930-х гадоў.

ІДЭЯ СА "...СТАХАМ"

Жаданне звярнуцца да аднайменнай аповесці Уладзіміра Караткевіча ўзнікла ў заслужанага артыста Беларусі, тагачаснага саліста тэатра Віктара Скорабагатава. У партыі збіральніка фальклору Беларэцкага ён шмат у чым увасобіў сябе самога: неўзабаве стварыў "Беларускую капэлу", скіраваную на пошук, вывучэнне і папулярызацыю помнікаў старадаўняй айчыннай музычнай культуры. А тую ідэю са "...Стахам" падтрымалі і ў тэатры, і ў Міністэрстве культуры, замовіўшы музыку маладому на той час кампазітару Уладзіміру Солтану — нядаўняму выпускніку прафесара, народнага артыста Беларусі Анатоля Багатырова. Лібрэтыстам выступіла Святлана Клімковіч. Напісаныя старонкі адразу прыносіліся ў тэатр для абмеркавання, кожны выказваў аўтарам заўвагі, просьбы (маўляў, зрабіце для мяне так і гэтак), даваў парады. Падобная практыка дае плён сярод аднадумцаў. Але наша трупа, узрошчаная амаль выключна на класіцы XIX стагоддзя, арыентавалася на традыцыйную драматургічна-стылёвую мадэль, што і была тады ўвасоблена.

Як паказала цяперашняя прэм'ера, тагачасныя нерэалізаваныя кампазітарскія задумы і накіды, памножаныя на крэатыўны пастаноўчы падыход, далі зусім іншую оперу — куды больш сучасную нават па сваёй драматургіі.

Спектакль пабудаваны па законах дэтэктыва і нават хорару. Замест звыклага опернага раскладу (экспазіцыя, завязка, кульмінацыя, развязка) глядач адразу паглыбляецца ў атмасферу страху, мільгаценне таямнічых падзей. Рэжысёр дадае такіх персанажаў Караткевіча (вядома, бязмоўных, бо не дапішаш за кампазітара іх магчымыя рэплікі), як Малы балотны чалавек, прывіды Блакітнай жанчыны. Больш падрабязнае знаёмства з галоўнымі героямі ажыццяўляецца не столькі праз арыі, колькі праз "партрэтныя" маналогі-развагі і ўвогуле адкладзена на другую дзею. Тая пачынаецца цяпер не з тужлівай песні селяніна Рыгора, а з відовішчнай народнай сцэны калядных абрадаў. Гэты кантраст яшчэ больш падкрэслівае сімволіку кожнай пастаноўчай дэталі.

Цягам усяго спектакля на авансцэне застаюцца гадзіннікі. Таямнічыя сведкі, яны быццам жывуць сваім уласным жыццём: то ідуць, то прыкідваюцца паламанымі, каб потым усё роўна выпраменьваць інфернальнае святло. І тым самым працягваюць зададзены і вытрыманы ў спектаклі дуалізм жывога і мёртвага, перададзены, у тым ліку, сістэмай двайнікоў, пры якой некаторыя героі маюць сваё супрацьлеглае адлюстраванне. Стах на партрэце ператвараецца ў чэрап. Засмажаны вяпрук у атачэнні ваяўнічых гасцей Дубатоўка — у шкілет, з якога тырчаць вантробы. Берман з выбеленым тварам — бы жывы мярцвяк. Нават частка вясельнага абраду ў пачатку другой дзеі асацыюецца з пакладаннем у труну.

Добра распрацаваны сам архетып палявання, у свой час даследаваны ў беларускай музыцы Радаславай Аладавай. Для яго больш яркай тэмбравай абмалёўкі кампазітар прадугледзеў старадаўнія беларускія сурмы — доўгія паляўнічыя трубы, што выраблялісь з суцэльнага дрэва. Для цяперашняй пастаноўкі іх вырабіў майстар Алесь Лось, пры гэтым у спектаклі задзейнічаны і сурмы з ранейшай сцэнічнай версіі. Фальклорны струмень традыцыйна спалучаны з тэмбрам жалейкі, змайстраванай Уладзімірам Пузынем.

ГЛЫБЕЙШАЯ ЗА ДЭТЭКТЫЎ

Гэта супрацьстаўленне жыватворнай, стваральнай народнай культуры і жудаснага, разбуральнага палявання пададзена і вонкава — праз два розныя аблічча каня. Для сялян ён — галоўны кармільца: і поле ўзараць, і дроў прывезці. Невыпадкова рэжысёр вывела на сцэну сапраўднага жывога каня — самага звычайнага, без аніякай спецыяльнай выпраўкі ды цыркавой падрыхтоўкі. Кранальны ў сваёй безабароннасці, ён мірна жуе сена. Такое рашэнне не прыхамаць, не даніна модзе, не жаданне ўразіць публіку "жывёлінай з заапарка", а ключ да разумення больш глыбокай за дэтэктыў маральна-філасофскай, духоўнай лініі спектакля. А вось узброены вершнік на кані нясе небяспеку. Дзікае паляванне — гэта жахлівыя ў сваёй велічнасці металічныя скульптуры "Вершнікі на дрыкгантах", зробленыя Уладзімірам Пілінным і Канстанцінам Касцючэнкам, сынам памерлага галоўнага мастака тэатра Аляксандра Касцючэнкі. Падвешаныя "між небам і зямлёй", яны павольна рухаюцца, спускаюцца долу за сваёй ахвярай, каб загнаць яе ў дрыгву.

Той жа холад металу — у сцэне балю. Мы бачым яго быццам вачыма Яноўскай, таму і вырашаны ён як жахлівы карнавал. Ніякай побытавай жанравасці, шляхетнага бляску "вечарынкі ў палацы". Госці — у масках, ваяўнічых строях. Дубатоўк — у масцы мядзведзя. А над усім — танцы за кратамі. На такое параўнанне наводзяць і рашоткі палацавай агароджы, і каркас старадаўняй сукенкі, што сціскае гераіню з усіх бакоў, і яна, бы тая птушка ці загнаны звярок, бяцца ў клетцы.

Спектакль атрымаўся шматгранны, прасякнуты сімволікай. Чым далей разгортваецца дзея, тым больш ён мадулюе ад дэтэктыву да прыпавесці. Ад гістарычных рэалій, памножаных на фэнтэзі, — да актуальных праблем сучаснасці. Разшчырага выратавальнага кахання, чым набліжаюць спектакль да меладрамы. Марта Данусевіч і Уладзімір Пятроў трактуюць узаемадносіны герояў як раўназначнае бацькоўска-дачкоўскае партнёрства, заснаванае на любові і ўзаемапавазе. Іх персанажы вартыя адзін аднаго і нават у чымсьці падобныя: абодва могуць сумняваецца ў сабе, але валодаюць вялікім духоўным патэнцыялам, маюць моцныя характары. Таццяна Гаўрылава і Аляксандр Гонца, які нядаўна з'явіўся ў нашым тэатры, "эмігрыраваўшы" на радзіму пасля вучобы і працы ў Расіі, увасабляюць унутранае прыцягненне ў класічным раскладзе запалоханай ахвяры, амаль даведзенай да страты розуму, і яе абаронцы, не надта схільнага да бурнай праявы эмоцый. Але на адкрыцці сезона Марта Данусевіч будзе спяваць з Уладзімірам Громавым — значыць, мы ўбачым яшчэ адзін варыянт раскладу ўнутры пары!

Вельмі рознымі атрымліваюцца і іншыя героі. Дубатоўк можа быць як пярэваратнем (Дзмітрый Шабеця), так і відавочным д'яблам (Сяргей Франкоўскі). Ягоны бліжэйшы паплечнік Варона, закаханы ў Яноўскую, — як гранічна жорсткім (Станіслаў Трыфанаў), так і насамрэч больш мяккім, што імкнецца паказаць сваю адпаведнасць сумнеўнай кампаніі (Андрэй Сялюцін). Свеціловіч — як горача закаханым (Тарас Прысяжнюк), так і крыху самаўлюбёным, у чымсьці саманадзейным (Аляксандр Міхнюк) ці ўвогуле "празрыста" тонкім інтэлігентам, здольным хаваць пачуцці ў душы, не расплёскваючы іх на публіку (Юрый Гарадзецкі). Рыгор паўстае і простым беларускім селянінам, мудрасць якога заснавана на багатым жыццёвым вопыце (Аляксандр Кеда), і зусім няпростым чалавекам, з якога мог бы ўзрасці дапытлівы даследчык (Андрэй Валенцій).

Але ў гэтым сезоне мы ўбачым не толькі новыя спалучэнні складу салістаў, але і іншых дырыжораў за пультам. Так, паказы ў верасні і кастрычніку правядзе Уладзімір Авадок. А гэта значыць, што, магчыма, нас чакаюць новыя цікавыя дэталі, бо кожны інтэрпрэтатар, нават абапіраючыся на распрацаваны варыянт, уносіць штосьці сваё. Адкрыцці працягваюцца!

ТРЫВАЛЫ ПАСТУЛАТ

Таму ў згаданым дуалізме жывога і мёртвага перамагае не хтосьці з герояў, а самое жыццё, што азарае кожнага непадобнасцю да іншых. Гэты пастулат спектакля застаецца трывалым. Астатняе — змяняецца разам з самімі персанажамі, характар якіх вызначаюць спевакі.

Так, Алена Золава і Уладзімір Громаў плённа развіваюць тэму кранальна маўляе з гледачом на самыя набалелыя тэмы — шчырасці і крывадушнасці, волі і прыгнёту (маральнага ці фізічнага — не так важна), адданасці і здрады, духоўнага святла і д'ябальскай цемры. Хіба ўсё пералічыш? Бо пры другім, трэцім праглядах адкрываюцца ўсё новыя дэталі, не заўважаныя раней. Дый кожны з трох, а то і чатырох складаў артыстаў уносіць разыначку, па-свойму расстаўляе сэнсавыя акцэнты. А як іначай, калі тут нават сярод гадзіннікаў няма двух падобных? Кожны з іх — увасабленне непаўторнай індывідуальнасці, згубіць якую — незаменная страта. Што ж тады казаць пра людзей?

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 36 / 4 ВЕРАСНЯ 2021 г.
Art-блог 9

Сюрпрызы Музычнага

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр адкрывае свой 51-ы сезон. Дата абрана — з тымі ж лічбамі, толькі ў зваротным парадку: 15 верасня. Паводле традыцыі, у дзень адкрыцця будзе дэманстравацца адна з нядаўніх прэм'ер — знакамітая рок-опера Аляксея Рыбнікава "«Юнона» і «Авось»" на лібрэта Андрэя Вазнясенскага.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фота Аляксея Мотчаны

Сцэна са спектакля "«Юнона» і «Авось»".

Фота Сяргея Чыгрына

Сцэна са спектакля "Граф Люксембург".

Гэты твор, напісаны і ўпершыню пастаўлены ў 1979-м, вядомы найперш па спектаклі, што роўна 40 гадоў таму з'явіўся ў Маскоўскім тэатры імя Ленінскага камсамола, атрымаў тэлевізійны запіс і стаў хрэстаматыйнай класікай. Нашу сцэну гэта рок-опера скарыла ў 2002-м і цягам 15-ці гадоў карысталася ў гледачоў вялікім попытам. А сёлета ў краса-віку вярнулася ў новай пастаноўчай версіі, сабраўшы яшчэ больш прыхільнікаў сярод публікі розных узростаў.

Рэжысёр Міхаіл Кавальчык зрабіў акцэнт не на шматслойную сімволіку закладзеных у твор мастацкіх вобразаў, не на ваганні галоўнага героя, сацыяльны аспект ці тэму кахання і вернасці, а на імклівае развіццё дзеяння. Атрымаўся прафесійны, бездакорна зроблены спектакль з добрым тэмпарытмам, моцнай энергетыкай і настолькі хуткім разгортам падзей, што іх асэнсаванне застаецца за дужкамі ўбачанага.

Відовішчнасці спрыяе нават не столькі сцэнаграфія Андрэя Меранкова і выкарыстанне відэа, колькі ўдзел артыстаў балета. Харэаграфія належыць Юліі і Мікалаю Міхайлавым — колішнім выпускнікам Пінскага каледжа мастацтваў, а потым БДУКМ (Мікалай застаўся тут выкладаць), стваральнікам танцавальнага праекта M.Y.D.C., што добра зарэкамендаваў сябе на розных фестывалях ды конкурсах. Харэаграфіі ў спектаклі многа, і ўся яна вельмі трапная, з апорай пераважна на сучасную эстрадную стылістыку. Нават у дуэце-візітоўцы "Я цябе ніколі не забуду", што вызначаецца адкрыта рамансавай лірыкай, — ніякай саладжавай да аскоміны неакласікі.

Гэта надае спектаклю стылёвую цэласнасць, на тое скіравана і новая аранжыроўка Льва Карпенкі, і яе дырыжорская інтэрпрэтацыя Марыны Трацяковай. Артысты пачуваюць сябе ўпэўнена, як спрактыкаваныя мараходы, што працуюць у камандзе. У цяперашнім спектаклі шмат масавых сцэн, заснаваных на руху, але ўсё працуе, бы добра адладжаны механізм.

Упэўнена, усе гэтыя якасці захаваюцца і надалей. Ды ўсё ж не дае спакою думка: няўжо мы і сапраўды так змяніліся ўсяго за чатыры дзесяцігоддзі, што хуткаплынны пераказ гісторыі становіцца больш важным за яе адрэфлексаванне?

Новае аблічча ў мінулым сезоне атрымала і аперэта "Граф Люксембург" Франца Легара, пастаўленая ў 2012-м. Не хвалюйцеся, удалая рэжысёрская версія Сусаны Цырук цалкам захавалася. Сюрпрызам і нават сапраўднай сенсацыяй стаў удзел у гэтым спектаклі расійскай кінаэкраны, заслужанага артыста Татарстана Марата Башарава. Прычым не ў ролі рамантычнага героя-палюбоўніка, якім многія запомнілі яго па тэлеэкране, а ў партыі смешнага князя Базінэлі, які вырашыў ажаніцца на маладзенькай артыстцы.

Заўважу, што гэта была не аднаразовая гастрольная акцыя: акцёр трывала "прапісаўся" ў складзе гэтага спектакля. Я патрапіла на трэці паказ, які традыцыйна лічыцца самым "правальным": маўляў, на першым усе хвалююцца, на другім паступова набываюць упэўненасць, а на трэцім настолькі расслабляюцца ў сваёй самаўпэўненасці, што ўсё ідзе наперакос. Дый расійскія антрэпрызы паспелі прывычыць нас, што многія раскручаныя экранам зоркі не надта прыдатныя да тэатральнай спецыфікі (а тут яшчэ — музычна-тэатральная, спевы з аркестрам, што патрабуюць дадатковай практыкі), дый часяком папросту халтураць: маўляў, публіка будзе ўдзячна самому майму з'яўленню на сцэне.

З Маратам Башаравым усё атрымалася наадварот.

Спектакль папраўдзе набыў новае дыханне. І не толькі таму, што артыст, нягледзячы на летнюю спякоту, выкладаўся "на ўсе сто": танчыў, спяваў, лётаў па сцэне матыльком, аблліваючыся потам у грувасткім шматслойным касцюме. Дарэчы, для пачаткоўай сцэны карнавалу па просьбе Башарава яму быў пашыты дзіўнаваты строй, якога не было ў спектаклі раней: герой ператварыўся ў гэткага амбіцыйнага вершніка на смешным маленькім слоніку, чыя галава з хобатам хістаецца наперадзе. Але ж звыклае тэатральнае амплуа хцівага камічнага старога было разбурана: мы ўбачылі задорнага, з бляскам у вачах мужчыну "ў самым росквіце сіл", апантанага прагай любові і гатовага зноў ды зноў увасабляць у жыццё пушкінскую формулу: каханню ўсе ўзросты падуладны. І любові да тэатра — таксама.

16 верасня на сцэне Музычнага — адметны балет Сяргея Мікеля "Пад · Свядомасць", прэм'ерай якога завяршаўся сезон. А неўзабаве нас чакае яшчэ адна прэм'ера: 23 і 24 верасня ў афішы пазначаны мюзікл Максіма Дунаеўскага "Тры мушкецёры".

Лялькі ў "...Куфры" і на вуліцы

Днямі фестываляў у нас паболее: 6 верасня Магілёўскі абласны тэатр лялек гасцінна прыме гледачоў і ўдзельнікаў тэатральных сустрэч "Лялькін куФЭр". Пра нязвыклую назву, што пішацца крыху насуперак арфаграфіі, некаторыя асаблівасці праграмы і іншыя цікавосткі мы распыталі дырэктара тэатра Уладзіміра Андрэенку.

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

— У назве нашых тэатральных сустрэч мы хацелі схаваць слова "фэст", — усміхнуўся Уладзімір Сцяпанавіч. — У друку гэта не перадаць, а на афішах добра відаць прыпісаныя знізу да ФЭ маленечкія літаркі — "ст". Ідэя ж фестывалю ўзнікла тры месяцы таму — пасля таго як нашаму калектыву надалі ганаровае званне заслужанага. Мы вырашылі адзначыць гэтую важную для нас падзею фестывалем, сабраць сяброў і паплечнікаў з усёй рэспублікі. Сігуацыя з каронавірусам толькі пацвердзіла, наколькі важна падтрымліваць творчыя сувязі між калектывамі, ладзіць нейкія сумесныя праекты, абменьвацца вопытам і проста дарыць публіцы новыя ўражанні. Вядома, гастролі цяпер вельмі ўскладняюцца — больш чым калісьці. Нас, да прыкладу, у пачатку лістапада паклікалі ў Бранск і Смаленск са спектаклем "Сіняя-сіняя" паводле Уладзіміра Караткевіча. Але ў тамтэйшых тэатрах дазваляецца запаўняць глядзельную залу толькі на 30 адсоткаў. Таму мы пакуль думаем, ці мае сэнс такая паездка.

На "Лялькін куФЭр", як бачыце, мы запрашалі толькі айчынныя калектывы. Знайшлі спонсара. Калі ўсё атрымаецца, спадзяемся надалей ператварыць гэты фестываль у міжнародны — магчыма, нават у наступным годзе. Таму сёлета імкнемся прадумаць усе дробязі.

Абнавілі хол, гэта трэба бачыць. Плануем зрабіць відовішчнае адкрыццё — з вулічнай імпрэзай, жывымі статуямі, раставымі лялькамі і, канешне, жывой музыкай: будзе граць вядомы магілёўскі Jazz City Band. А ў зале пакажам свой "Самы маленькі самалёт на свеце". Мы абнавілі гэты спектакль і 27 верасня павязем яго ў Маскву, на Міжнародны вялікі дзіцячы фестываль. Як паведамілі арганізатары (а мастацкім кіраўніком гэтага праекта з'яўляецца народны артыст Расіі Сяргей Бярукаў), было пададзена 307 заявак. Сярод іх былі адабраны 50 — і наш спектакль сярод іх.

Завяршаць "Лялькін куФЭр" будзем таксама сваёй пастаноўкай — "Кандыд, або Аптымізм". Гэты спектакль таксама атрымаў некаторыя змены: у галоўнай ролі цяпер можна ўбачыць Цімура Карэпіна, які летась скончыў Расійскі дзяржаўны інстытут сцэнічных мастацтваў, некаторы час працаваў у Магілёўскім драматычным тэатры, а цяпер перайшоў да нас — рэжысёрам-пастаноўшчыкам, ставіць "Маленькага прынца".

Сярод іншых спектакляў, уключаных у праграму тэатральных сустрэч, — сталічны "Пансіён Belvedere", маладзечанскія "Шматкі па закавулачках", брэсцкі "Халстамер", гомельскі спектакль "Fable (Басня)". На жаль, у апошні момант высветлілася, што не зможа прыехаць тэатр "Лялька" з Віцебска, таму іх "Казкі пра казку" мы замянілі двума сваімі паказамі — гэта будуць "Муха-Цакатуха" і "Волат-Эгаіст". У наш тэатр прыйшло шмат добрай моладзі — будзем развіваць, розных задумак багата.

Твой 13-ы цуд

У Оршы, у памяшканні былога Езуіцкага калегіума, дзе месяцца гарадская мастацкая галерэя імя Віктара Грамыкі, адбываецца персанальная выстава віцебскага мастака і дызайнера Аляксандра Вышкі — "LIGHT VOLUME. XIII цуд свету". Тое, што прадстаўлена ў экспазіцыі, сам аўтар называе "светла-дынамічным жывапісам".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Захавальнік таямніц. 2013 г.

Аляксандр Вышка — вядомы і паважаны ў прафесійным і калямастацкім асяроддзі чалавек. На ягоным творчым рахунку — распрацоўка шэрага музейных і выставачных экспазіцый; узоры графічнага дызайну, сярод якіх вылучаецца фірмовы стыль "Славянскага базару ў Віцебску", арыгінальныя жывапісныя і графічныя творы. Ёсць мастакі, якія занадта доўга шукаюць справу, да якой можна прыстасаваць свой талент, ніяк не могуць акрэсліцца адносна свайго прафесійнага прызначэння; высветліць, што для іх увогуле істотна, а што не. Прыходзіць аднойчы такой асобе час азірнуцца на жыццё, падсумаваць зробленае, а за спінаю — нічога, акрамя спантанных эксперыментаў без відавочных вынікаў. Спадар Аляксандр не з гэтага шэрага. Ён не пускае свой талент у распыл, хоць і займаецца самымі рознымі справамі. Частка ягоных спецыялізацый згадана мною вышэй. Рэч у тым, што ягоная разнапланавасць — гэта найперш магчымасць раскрыць для сябе і іншых грані ўласнага таленту пры наяўнасці даволі канкрэтнай мэты. У маіх вачах ён асоба, якая хоча палепшыць матэрыяльная асяроддзе чалавека, што ў сваю чаргу паспрыяе гарманізацыі чалавечай натуры. У сэнсе канцэптуальным гэта дызайн у чыстым выглядзе.

Я памятаю яго яшчэ студэнтам. Мы аднакурснікі. Мяне яшчэ тады ўражвала ягоная здольнасць эфектна і якасна зрабіць якую заўгодна працу. Памятаю, усе вельмі хваляваліся, ці зацвердзяць нам дыпломныя тэмы. Бо кожны абіраў тое, на што здольны, на чым думкі сканцэнтраваныя, што, здаецца, лепш разумее і адчувае. А вось Аляксандр казаў: "А мне ўсё адно. Я любую тэму зраблю". І насамрэч, спачатку браўся за адну тэму, якую кафедра не зацвердзіла, а на абарону выйшаў з іншай. І абараніўся выдатна.

Ён і цяпер такі. Аляксандр кажа: "Бяруся за любую работу. Нават калі напачатку яна мне не цікавая. Я імкнуся ў нешкавым цікавае знайсці і на гэтым засяродзіцца. Я і студэнтаў гэтаму вучу: няма кепскіх тэм, ёсць кепская рэалізацыя. Гэта як у тэатры: можна "Рамэа і Джульету" паставіць, сыграць бяздарна, а можна геніяльна. А тэкст адзін і той жа".

Да светлядынамічнага жывапісу спадар Аляксандр прыйшоў амаль выпадкова. Гэта калі ўвогуле лічыць, што ў творчасці ёсць месца выпадковасці як з'яве. Мне асабіста бліжэй думка, што выпадковасць — гэта не што іншае, як праява лёсавызначальнай неабходнасці. Так яно і паводле філасофскай тэзы, і па жыцці. Проста ў нейкі момант мастаку стала цесна ў двухмернай прасторы аркуша ці палатна, і нават трохмернасць аб'ёмных рэчаў яго ўжо не задавальняла. Захацелася выйсця ў чацвёртае вымярэнне — у час. Вывесці аб'ект са статыкі ў дынаміку, у анімацыю, у працэс.

Сэнс светладынамікі ў тым, што выява прадстае ў вачах публікі рознай у залежнасці ад асвятлення. Паколькі скарыстоўваюцца фарбы, што святло назапашваюць, і фарбы, што святло адлюстроўваюць, пры розным асвятленні ствараюцца розныя візуальныя вобразы. Пры звычайным асвятленні адно, пры накіраваным на рэч ультрафіялеце — другое. А яно яшчэ і ў поўнай цемры зіхаціць. І гэта ўжо не проста мастацкая выстава ў звыклым разуменні, а падабенства светлавога шоу. Нешта падобнае на тэатр, бо і ў тэатры сцэнічны вобраз ствараецца, сярод іншых чыннікаў, спецыяльным асвятленнем.

Сваё вынаходніцтва спадар Аляксандр назваў "цудам свету". Прычым трынаццатым. Не думаю, што такім чынам ён хацеў прысуседзіцца да Егіпецкіх пірамід ці Вавілонскай вежы. "13" — лічба не сакральная. Гэта не "7" і не "12". Двухсэнсоўная, няўцямная нейкая лічба... Я вось, да прыкладу, упэўнены, што нарадзіўся пад трынаццатым знакам Задыяка, які ёсць, але яго не заўважаюць, каб не псаваў умоўную гармонію зорнага неба, увасобленага менавіта ў дванаццаці сузор'ях. Можа, і ў спадара Аляксандра такія ж думкі... Але хутчэй за ўсё, даючы свайму творчаму праекту такую прэтэнцыёзную назву, аўтар меў на ўвазе тую акалічнасць, што цуды — гэта не толькі старажытныя міфы і неразгаданыя загадкі быцця, што заганяюць у ступар і дылетантаў, і навукоўцаў. Яны вакол нас паўсюль. Проста трэба вочы расплюшчыць і пабачыць звыклае ў іншым асвятленні. І тады кожны можа, нібыта выпадкова, сутыкнуцца са сваім уласным 13-м цудам свету.

Яму забыліся сказаць, што лётаць нельга.

“Я паважаю сябе, бо паважаю вас”… Гэта наша, беларускае, замешанае на спрадвечным гонары. Адпачывала пляменніца ў Грузіі. Згадвала, як уражаны быў мясцовы таксіст: “Не лаецеся, смецце праз вокны не выкідаеце, на роднай мове размаўляеце — Еўропа!” А я б дадаў: “Культура!” Адкуль што бярэцца? Няўжо толькі маладым надакучыла быць памяркоўнымі?
Не! Узрост, я перакананы, тут ні пры чым. Старэнькая бабуля на Драгічыншчыне заходзіць у краму, кіёк звонку пакідае, а мне важна тлумачыць: “Паляшуцкая культура такая”. Культура… Культура! Сябра Віця Стрыжак з рэчыцкай Заспы да апошніх дзён сваіх Маму называў на Вы. Культура! Дык адкуль яна?
Мяне зразумее зараз толькі той, хто любіць Беларусь. Шляхетнасць — у крыві. У павароце шыі вунь той вясковай кабеты — вытанчаная пастава князёўны. У выразных вачах вялікага Разанава — спакойная ўладарнасць вялікага Вітаўта. Ва ўсмешцы ссівелага дзеда — паляшуцкая вынаходлівасць гаспадара лесу, ракі і балота. І моліцца ён небу, сонцу і чалавеку.
Культура! Яна ў матчынай песні, дзедавай прыпавесці, у вышываным ручніку ды звонкім гліняным збанку. І ўсё гэта перадаецца з роду ў род шчырым позіркам, гарачым пацалункам, пяшчотным дотыкам ды ўзнёслым словам. Працэс няспынны, бо натуральны. Птушаняты не пытаюцца ў маці, як лятаць. Яны становяцца на крыло, праз якое і прарастае культура, чытай — шчаслівае ўменне лунаць над небам Беларусі. Курыруюць працэс “прарастання” гісторыкі, музыканты, літаратары, работнікі культуры. Дай Бог, каб так яно і было.

Яўген РАГІН

Кентаўры з Бабровай даліны

Карацей, гаворка — пра пераемнасць традыцый. Між іншым, гэтая тэма — адна з галоўных пад рубрыкай “На людным месцы”. Сённяшні нумар не выключэнне. Намеснік дырэктара **Зэльвенскай** раённай бібліятэкі Вольга Камякевіч піша пра тое, што Ганненскаму кірмашу споўнілася 300 гадоў, што ў брэндавым свяце бібліятэкары бяруць пастаянны ўдзел і кожны раз імкнуцца здзівіць удзельнікаў. *“Мы арганізавалі падворак-інсталяцыю “Кніжная крама “Аракул” у стылі XVIII стагоддзя, —* распавядае Вольга Камякевіч. — *Паколькі сімвалам кірмашу з’яўляецца конь, то на кніжнай выставе можна было пазнаёміцца з малавядомымі фактамі пра гэту жывёліну. А яшчэ на свята прыехалі паэты-землякі”.*

Аповед пра Ганненскі кірмаш дапаўняе намеснік дырэктара **Зэльвенскага** раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Наталля Мацвейчык: *“У рамках конкурсу сельска-гаспадарчых падворкаў “Местачковы фэст” прэзентаваліся мясцовыя легенды, абрады, песні і танцы, традыцыйная кухня. Разгарнуўся продаж рамесніцкіх вырабаў, аўтарамі якіх выступілі больш за 800 майстроў. Музей пад адкрытым небам “Скарбонка талентаў” дэманстраваў больш за сто экспанатаў, сабраных з кірмашоў, што адбываліся з 2001 года па 2019-ы. Асаблівы каларыт мела мерапрыемства “Легендарныя Эпохі”. На інтэрактыўных пляцоўках прайшлі інсцэніроўкі, рэканструкцыі, тэатралізацыі, звязаныя з часамі вікінгаў, рыцараў, шляхты”.* Так што ў жылах нашых — і кроў вікінгаў з рыцарамі.

На **Шчучыншчыне**, аказваецца, ёсць Бабровая даліна. Пры яе наяўнасці цалкам натуральным падалося правядзенне Дня бабра. Старшыня **Астрынскага** сельвыканкама Наталля Лебядзевіч называе ўсё гэта канструктыўнай мясцовай ініцыятывай і ўсяляк яе падтрымлівае. Таму цалкам заканамерным стала і ўзнікненне аграсядзібы “Конны двор “Кенатаўр”. Яе гаспадыня Людміла Босак прапанавала сваіх “кентаўраў” на свята. “Бабры” не былі супраць. У лік вершнікаў трапіла не толькі дзятва. Дарослыя таксама былі шчаслівыя. Мужчыны адразу адчулі сябе вікінгамі. Кабеты ж стараліся справай пацвердзіць кулінарную спрактыкаванасць. А напрыканцы мерапрыемства ўсе разам варылі на вогнішчы кампот з садавіны.

Гаворка пра святы спрыяе святочнаму настрою. Таму працягнем. Метадысты са **Свіслацкага** раёна распавядаюць пра свята “Гумараць землякі”. Ахвотныя з усяго раёна паказвалі маналогі, мініяцюры, канцэртныя нумары, байкі прыпеўкі. Словам, таленавітых гумарыстаў было шмат. Суцэльны вір гульні ўтварыў вакол сябе народны тэатр-студыя “Карагод”.

А вось свята “Наш край — кветкавы рай” аграгарадка **Мілевічы Мастоўскага** раёна. Святу споўнілася пяць гадоў. Месца яго правядзення невыпадковае: ля кожнага дома — кветкавае мора. А ў той дзень кветкі былі паўсюль. Не толькі на кветніках, але і ў букетах, вазонах, на жывапісных карцінах, падушках і ручніках. Канцэртную праграму распачало дэфіле “Белы анёл” з удзелам прыгажунь розных узростаў.

Чарговае свята — “Калейдаскоп Дубненскага краю”. Гэта таксама **Мастоўскі** раён — аграгарадок **Дубно**. Гэта своеасаблівая салянка-зборная, і даволі “смачная”. Гаворка тут збольшага пра сям’ю. Прайшоў парад вазкоў для немаўлят. Выказалі ўдзячнасць бацькам самага малодшага жыхара вёскі — Цімафея Шапеля. З яго нараджэннем бацькі Аляксандр і Наталля Шапелі набылі для сваёй сям’і статус шматдзетнай. Падчас “Калейдаскопу...” вызначылі лепшыя кветнік і двор.

Духмяная выпечка, шмат музыкі і эмоцый... Гэта пра свята “Каравай у печы чакае сустрэчы”. Удалая не толькі назва, але і сама брэндавая акцыя. Лепшыя гаспадыні раёна другі год збіраюцца ў **Крупаўскім** доме культуры. Пірагі-караваі выпякаліся не толькі па розных рэцэптах, не толькі мелі самае рознае начынне: з лясных і садовых ягад, маку, сухой садавіны. Уся смакота яшчэ і па форме адрознівалася. І ў гэтым таксама — спрадвечная традыцыя, якую старанна зберагаюць ды развіваюць.

На здымках:
1. **Конь і падкова — сімвалы Ганненскага кірмашу.**
2. **Краязнаўцы са Свіслацкай дзіцячай бібліятэцы.**
3. **Дэфіле “Белы анёл” у аграгарадку Мілевічы.**
4. **Падчас прэзентацыі кнігі “Падарунак чараўніка”. Пісьменнік раздае аўтографы чытачам.**
5. **На выставе ў Мазалаўскай сельскай бібліятэцы.**
6. **Вось ён — каравай Лідчыны.**

Цяпер — пра свята сыра. Мерапрыемства "Вясковы сыравар" некалькі гадоў ладзіцца ў **Жупранах Ашмянскага** раёна. Прадукцыю ўласнай вытворчасці прэзентавала Дзіяна Купрыянюк, якая суперничала з усім Ашмянскім сырзаводам. У выніку перамаглі літаральна ўсе ўдзельнікі свята, бо сыру хапіла для кожнага ахвотнага.

Дар'я Марцінкевіч — загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Лідскай** раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы. Яна напісала аб праекце, прысвечаным кастанайцу, лётчыку, двойчы Герою Савецкага Саюза Леаніду Бядзе. Праект аб'яднаў пяць краін — Казахстан, Расію, Беларусь, Польшчу і Германію. Асноўная задача праекта — усталяваць супрацоўніцтва паміж паселішчамі краін СНД і далёкага замежжа, пры вызваленні якіх былі здзейснены подзвігі з прысваеннем звання Героя Савецкага Саюза, кавалера трох ордэнаў Славы, і населенымі пунктамі, дзе нарадзіліся і выхоўваліся будучыя Героі...Міжнародную практычную анлайн-канферэнцыю "Леанід Бяда: жыццё, аддадзенае небу" арганізавала Кастанайская абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка імя Льва Талстога (Казсахстан). У якасці спікера канферэнцыі выступіла Лідская бібліятэка.

У **Воранаўскай** раённай бібліятэцы і ў філіяле Радунская гарпасялковая бібліятэка адбылася сустрэча з маладой пісьменніцай Воранаўшчыны Аленай Запаснік. Яна прэзентавала кнігу казак "Падарунак чараўніка". Цудоўныя тэксты ды яшчэ з прыгожымі ілюстрацыямі прыйшліся маленькім чытачам даспадобы. Кожны захацеў мець аўтограф спадарыні Алены.

Лета запоўнілася чытачам **Свіслацкай** дзіцячай бібліятэкі прыгодамі на краязнаўчым маршруце "Крочым родным краем, фарбы ўсе збіраем". Маршрут жніўня быў прысвечаны 765-годдзю Свіслачы. Пра гэта напісала загадчык згаданай установы Тамара Яцэвіч.

І заканчвае сённяшні агляд Андрэй Струнчанка з "казачнай" навіной пра культурнае жыццё вёскі **Мазалава Віцебскага** раёна. У мясцовым сельскім доме культуры і бібліятэцы прайшла акцыя "У гасцях у казкі", на якую запрашаліся дзеці з аздараўленчага летніка дзённага знаходжання мясцовай школы. Дзеці пазнаёміліся з кіраўніком дзіцячага аматарскага калектыву "Магія творчасці" Алай Антаненка і яе персанальнай выставай работ.

Сустрэнемся праз тыдзень!

К

Хобі — гэта рыбалка, а творчасць — зусім іншае

У Лідскім аддзеле рамёстваў і традыцыйнай культуры адбылося чарговае пасяджэнне сяброў клуба "Вытокі", якія сустрэліся з самабытнай мастачкай Гродзеншчыны Ганнай Пуйдак.

– На аўтарскай выставе Ганны Іванаўны пад назвай "Магічныя травы" дэкаратыўна-прыкладное мастацтва прадстаўлена ў двух кірунках: вышыўка ў тэхніцы крыжа і фларыстыка ў плоскасці, — распавядае малодшы навуковы супрацоўнік Марына Савіцкая. — Галоўная задумка экспазіцыі — паказ прыгажосці прыроды...

А ўсё пачалося ў Ганны Іванаўны з ранняга дзяцінства. Галоўным наватарам ідэй і натхняльнікам для яе была маці, а першым інструментам у працы стала іголка. "Мама сядзела за кроснамі, а я вышывала", — згадвала майстрыха. Цяжка пералічыць, колькі сарочак, сурвэтак ды ручнікоў упрыгожаны яе рукамі.

Вельмі плённым для Ганны Іванаўны быў час захаплення роспісам па шкле. Ён быў распаўсюджаны пад уплывам еўрапейскай моды на тэрыторыі Беларусі ў 50-я гг. мінулага стагоддзя. Найбольш папулярнымі матывамі служылі букеты кветак, ідэалістычныя сцэнкі з выявамі людзей і жывёл, закаханых пар, радзей — біблейскіх сюжэтаў. На гатовы роспіс накладалася каляровая фольга, таму паверхня зіхацела і перадавала празрыстасць шкла.

– Час роспісу для мяне прыйшоўся на 60-я гады. Спрыяла хваля запатрабаванасці ў нашай мясцовасці. Аднавяскоўцы набывалі і ўпрыгожвалі хатні інтэр'ер такімі карцінамі. Асабліва ўрачыста выглядаў роспіс акладаў у праваслаўных іконах, калі яны віселі групай, пакрытыя набожнікамі, — працягвае свой аповед Ганна Іванаўна. — Мне хацелася маляваць такія аклады на сваіх каталіцкіх. Пачытаць, як гэта зрабіць, і павучыцца не было ў каго. Купіла пяро, асадку, туш, "Ленінградские" фарбы і праз памылкі самастойна дабілася выніку...

Ганна Іванаўна на практычным занятку з удзельнікамі клуба "Вытокі" дала майстар-клас роспісу па шкле, падзяліўшыся асноўнымі сакрэтамі майстэрства. З хатняй калекцыі мастачка прадставіла гледачам некалькі работ з выявамі кветак, варыянты акладаў на іконах.

Ганна Іванаўна Пуйдак з фларыстыкай.

Майстар-клас нанясенне контураў тушшу.

Шмат пытанняў атрымала Ганна Іванаўна пра фларыстыку. Гэта вельмі старажытны род заняткаў. Ён патрабуе навыкаў назірання за навакольным светам, ведаў па зборы і захаванні зёлак, ведання асноў колеразнаўства і кампазіцыі.

– У мяне тут шматгадовы вопыт. Зёлкі можна нарыхтоўваць у любую пару года, а вялікая колькасць казурак ляжыць на ўзбочынах дарог, якія гінуць, трапляючы на шкло сустрэчных машын. Правільна засушаныя матылькі і казуркі гарманічна дапаўняюць і ажыўляюць кветкавыя нацюрморты. Пісьменна складзеныя кампазіцыі захоўваюць колер да шасці гадоў! Насычанасць будзе павольна затухаць, калі работы аддаліць ад прамых сонечных промянёў, — працягвае гаворку аўтар.

Дарэчы, фларыстычныя работы Ганны Іванаўны знаходзяцца ва ўласных калекцыях знатакоў мастацтва Беларусі, Расіі, США, В'етнама і іншых дзяржаў.

У жыцці здараецца так, што людзі, атрымаўшы мастацкую адукацыю, не маюць прафесійнага росту. У выпадку з нашай гераіняй усё наадварот. Не маючы мастацкай адукацыі, але пастаянна займаючыся самаадукацыяй, жанчына сама сябе падняла на высокі прафесійны ўзровень. На пытанне, чым з'яўляецца для яе мастацтва: хобі ці работай, адказ быў упэўнены і кароткі: "Хобі для мяне — рыбалка, а заняткі творчасцю — неабходнасць майго існавання!"

Ірына ДЫДЫШКА,
метадыст аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Лідскага раённага цэнтр культуры і народнай творчасці.

Скляпнікі і пітушкі…

На Свіслаччыне, у Поразаўскай бібліятэцы — цэнтры краязнаўства, адбыўся вечар-партрэт "Самабытны ганчар", прымеркаваны да стагадовага юбілею поразаўскага майстра чорназдымленай керамікі Іосіфа Шопіка, лаўрэата Другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, удзельніка ВДНГ СССР (бронзавы медаль) і ВДНГ БССР.

Месцам правядзення мерапрыемства стаў музейны пакой "Мастацтва гліны і агню". Менавіта ў ім захоўваецца мноства экспанатаў і фотаматэрыялаў, што распавядаюць пра поразаўскага ганчара. Кераміка Шопіка экспануецца і ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, іншых музеях Рэспублікі Беларусь.

Кераміка майстра.

Іосіф Шопік за ганчарным кругам.

Чаго толькі не тварылі рукі народнага майстра: вялікія гаршкі і сераднякі, скляпнікі і пітушкі, мяліцы і макотры, збаны і гарлачы, кубкі і вазоннікі, трохногія патэльні і рознафігурныя пасвісцёлкі для дзяцей.

Сваімі ўспамінамі пра Іосіфа Іосіфавіча падзялілася пляменніца Тарэса Рудоміна. Яна адзначыла, што дзядзька быў чалавекам не толькі таленавітым і працавітым, але лагодным, гасцінным і заўсёды жыццярадасным. Аб яркіх момантах сустрэч з выдатным ганчаром распавялі Рамуальд і Яніна Сакалоўскія, Ніна Калач.

Тэматычным было і музычнае суправаджэнне мерапрыемства. На працягу вечара гучалі песні пра ганчарнае рамяство і родны край.

Аксана ЦІТОК,
бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Свіслацкай раённай бібліятэкі.
Фота з архіва бібліятэчнага музейнага пакоя.

Вітаміны для настрою

Падчас Іўеўскага свята выкарыстана... мора таматаў

Не, расход таматаў падчас свята не сакрэт. Проста ніхто не падлічваў, колькі тых памідораў было выкарыстана. Гэта, бадай, адзіныя матэрыяльныя выдаткі, якія пацярпеў раён на "Іўеўскім памідоры". Дый выдаткі тыя можна лічыць шараговым спонсарскім укладам тутэйшых самаадданых агароднікаў у агульную справу таматнага вяселля. А вось маральнае задавальненне ад свята падлічыць немагчыма. Яно не мае ні канца, ні краю, таму застаецца ўнікальным па форме і змесце, цягам года грэе душу мясцовага жыхара не толькі таму, што не мае ў рэспубліцы аналагаў, а яшчэ і з той прычыны, што дадае раёну брэндавай выразнасці.

Свята "Іўеўскі памідор" пачынаецца.

Заплыў на чым папала.

Сіньёр Памідор і мадам Памідорына на абы-чым не ездзяць.

ПОМНІКІ І МУЗЕІ

Памідорам ставяць помнікі ў многіх гарадах свету. У Грэцыі і Італіі ёсць музеі памідораў. Помнікі іўеўскаму тамату раскіданы па вуліцах раённага цэнтра. Гэта вялікія ды маленькія цяпліцы, дзе вырошчваецца цуд-гародніна. І калі казаць шчыра, то гэта помнікі не толькі смачным памідорам, але і тым старанным працаўнікам, што іх вырошчваюць.

Любая добрая справа патрабуе максімальнага прыкладання сіл. Таму "Іўеўскі памідор" — гэта яшчэ свята тых, хто працуе на зямлі, хто забяспечвае нас смачным таварам, што захоўвае цеплыню рук агароднікаў. А прыдумала свята Наталля Мудрык — намеснік дырэктара Іўеўскага цэнтра культуры.

БУТЭРБРОД ЗА ДЗЕНЬ НЕ З'ЕСЦІ

На пачатку свята быў дадзены старт закатак. Права закатаць першы слоік іўеўскіх таматаў ураджаю 2021 года было прадастаўлена старшыні Іўеўскага райвыканкама Ігару Генцу, загадчыку сектара культуры Святлане Кішкель і былому старшыні мясцовага райвыканкама Аляксандру Булаку (гэта пры ім у 2017 годзе прайшло першае памідорнае свята). Зазначым шчыра: не было тых, хто ў гэтым конкурсе прайграў.

Таматны бой.

Падчас памідорнага свята.

Святочнае напружанне значна ўзрасло, калі ў цэнтр увагі трапіла адна з галоўных фішак мерапрыемства — памідорны бутэрброд у некалькі квадратных метраў і з адпаведным сертыфікатам (маўляў, не муляж)! Пачаставаліся ўсе ахвотныя.

ЧАРГОВЫЯ ГАСТРАНАМІЧНЫЯ РЭКОРДЫ

Зараз многія пашкадуюць, што не патрапілі на наша памідорнае свята. На шыкоўным аўто выехалі вядучыя: сіньёр Памідор і мадам Памідорына, якія абвясцілі конкурс на паяданне таматаў на хуткасць. Кожны з удзельнікаў пераканаўся пад апладысменты, што смак свята — непаўторна салодкі.

А потым было раённае спаборніцтва на лепшы гародніны карнавальны касцюм "Круты Памідор — таматная сямейка". Праходзіў конкурс на канцэртнай пляцоўцы "Тамаці-Паці".

НА ЧЫМ ПАПАЛА

Воднае шоу "Плаў-Тамат" пад памідорнай эгідай ладзілася ўпершыню. На возеры адбыліся заплывы на чым папала. Акцыя паказала, што фантазіі ўдзельнікаў няма мяжы.

Вельмі натуральна дзея перанеслася на пляцоўку "Памідорная спартыўная". Вось тут і пачалася памідорная баталія, вынікам якой сталі мора смеху і радасці і мора памідораў, раструшчаных падчас "перастрэлкі".

НЕ АБЫШЛОСЯ БЕЗ ВІРТУОЗА

Увечары выступіў балалаечнік-віртуоз Аляксандр Варанішча. Потым была чарга музычнага тэатра "Рада". А закончылася ўсё неонавай дыскатэкай. Моладзь танцавала таксама віртуозна... Не, сапраўды, у нашых памідорах ёсць эфектыўныя вітаміны творчай бадзёрасці. Так што "Іўеўскаму памідору" быць і развівацца.

Святлана ЛУГІНА, вядучы метадыст па асноўных жанрах аддзела метадычнай работы Іўеўскага цэнтра культуры і дасугу.
Фота з архіва Іўеўскага цэнтра культуры.

Там, дзе цякуць малочныя рэкі

У аграгарадку Сурынка Слонімскага раёна прайшло свята малака "Малочны край — людзям рай". Можна лічыць гэтае мерапрыемства візітоўкай названай вёскі. Тут здавён умеюць эфектыўна працаваць з малочным статкам.

Падчас свята можна было прадэгуставаць, а таксама набыць малочную прадукцыю ад мясцовых гаспадынь, ад прыватнай гаспадаркі "Смаката" і Слонімскага вытворчага цэха Шчучынскага маслосырзавода.

Былі адзначаны лепшыя работнікі малочна-таварнай фермы сельскагаспадарчага прадпрыемства імя Суворава. Траім перадавікам падаравалі стокілаграмовых бычкоў.

Ладзіліся конкурсы "Малочная гаспадыня", "Мая лепшая кароўка"... Працавалі гандаль, атракцыёны, фотазона. Калектывы мастацкай самадзейнасці раёна падрыхтавалі канцэрт.

Падчас свята.

Ганна ПАНАШЧЫК, загадчык аддзела метадычнай і культурна-масавай работы Слонімскага раённага цэнтра культуры, народнай творчасці і рамёстваў.

Дні беларускай культуры. 2020 г.

З удзячнасцю да Беларусі

Заканчэнне. Пачатак на ст. 3.

— Якую падтрымку ваша суполка на сёння атрымлівае з Беларусі?

— Шмат гадоў таварыства "Уздым" і ЦБК працуюць з разлікам толькі на свае сілы, на дапамогу членаў-сяброў і асноўную падтрымку ад мясцовага самакіравання. Мы шчыра захоўваем сваю этнічную ідэнтычнасць і беларускую культуру ў краіне пражывання, знаёмім з ёй латвійцаў. Гэта ідзе ад чыстага сэрца, з удзячнасцю Радзіме за тое, што на беларускай зямлі мы нарадзіліся, атрымалі адукацыю і выхаванне, сталі годнымі людзьмі і жадаем нешта добрае зрабіць для Беларусі. Таму, калі ў Беларусі была магчымасць аказаць падтрымку, мы заўсёды яе прымалі і шчыра дзякавалі. Напрыклад, на адкрыццё Цэнтра беларускай культуры ў Даўгаўпілсе ў 1999 годзе Міністэрства культуры Беларусі падарыла ансамблю 12 народных строяў, якія мы беражом і працягваем выкарыстоўваць, бо якасць выдатная. Да 2014 года дапамога была перыядычнай, а пасля прыняцця Закона аб суайчынніках замежжа набыла сістэмны характар.

Па дзяржаўнай праграме "Беларусы ў свеце" атрымалі шмат разнастайных кніг мастацкай літаратуры, энцыклапедый, дзіцячых выданняў, метадычных матэрыялаў выдатнай якасці. Для падрыхтоўкі мерапрыемстваў і пашырэння далягляду гэта важны ўнёсак у жыццё беларускай дыяспары.

Другі напрамак — канцэртныя касцюмы. У Беларусі іх вырабляе мастацкая фабрыка "Скарбніца", таму строі па-сапраўднаму нацыянальныя, а не нейкі кіч "а-ля беларус". Да 25-годдзя ансамбля "Купалінка" мы атрымалі ў падарунак вялікія хусткі, якімі жанчыны павязваліся ў халодны час.

Па лініі дыпламатычных прадстаўніцтваў Беларусі штогод атрымліваем дапамогу ў арганізацыі вялікіх мерапрыемстваў: банеры, афішы, календары. Нядзельная школа "Вясёлка" ніколі не застаецца без падарункаў: падручнікі, сшыткі, дзённікі, магнітныя дошкі, салодкія наборы на Каляды. Дарэчы, у 2018 і 2019 гадах выхаванцы школы "Вясёлка" прымалі ўдзел у Прэзідэнцкай ёлцы ў Мінску — гэта быў сапраўды ўражлівы і незабыўны падарунак Беларусі.

На мой погляд, найбольш карысная падтрымка, з перспектывай на развіццё беларускай дыяспары, — гэта творчыя стажыроўкі для кіраўнікоў ансамбляў і суполак, якія штогод выдатна арганізуе Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур на базе Дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Мы шмат гадоў жывём не ў беларускім моўным і культурным асяроддзі, таму такое паглыбленне ў культуру — як глыток свежага паветра, дае новыя сілы, ідэі, кантакты, сувязі.

Якая дапамога падаецца найбольш істотнай? Запрашэнне на святы і фестывалі ў Беларусь. Бо без пастаяннай сувязі з этнічнай радзімай, з носьбітамі мовы працэс хутка сыдзе на "не". А з латышскай культурай мы слухачоў на канцэртах абавязкова знаёмім, спяваем некалькі песень, нават з перакладам на беларускую мову. Ведаеце, па вопыце: больш гасцінна, чым у беларускай вёсцы, нідзе не прымаюць! Мы з вялікай адказнасцю і задавальненнем выступаем і ў аграгарадках, дзе вышэйшая пашана гледачоў — абараныя палісаднікі, калі ўсе кветкі яны прынеслі ў Дом культуры для нас.

Купалінка. Даўгаўпілс. Латвія. 2020 г.

На канферэнцыі.

— Ці часта да вас трапляюць цікавыя госці з Беларусі?

— Апошнія амаль два гады мы не былі ў Беларусі, а беларусы не былі ў Даўгаўпілсе. Каранавірусныя абмежаванні зачынілі межы, але нашы стасункі не спынены і не разгублены, яны перамясціліся ў віртуальнае асяроддзе. Раней штогод мы прымалі шмат розных гасцей з Беларусі: навукоўцаў і даследчыкаў на канферэнцыі "Беларускія чытанні ў Даўгаўпілсе", аматарскія ансамблі на Дні беларускай культуры ў Даўгаўпілсе і свята Купалля; ансамблі, спевакоў, рамеснікаў, афіцыйных прадстаўнікоў з аддзелаў культуры райвыканкамаў на фестывалі "Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе"; бардаў на Фестывалі беларускай аўтарскай песні ў Даўгаўпілсе, а таксама мастакоў, тэлевядучых, журналістаў, выкладчыкаў універсітэтаў са студэнтамі, дэлегацыі беларускіх урачоў і проста турыстаў з Беларусі. Спадзяюся, паступова ўсё адновіцца.

— Адно з самых важных пытанняў — забеспячэнне пераемнасці пакаленняў. Ці ёсць з гэтым праблемы ў вашай супольнасці — і калі так, дык як вы іх вырашаеце?

— Ва ўмовах глабалізацыі, інфарматызацыі, змешаных сем'яў і пражывання за межамі этнічнай радзімы вытокі творчага ноў-хаў знаходзяцца ў бацькоў і ў нацыянальнай школе, каб моладзь зацікавілася сваімі каранямі. Няма школы — застаюцца бацькі, канешне, калі ў іх самых ёсць цікавасць да сваіх каранёў. На жаль, у Даўгаўпілсе беларускую школу ў час адраджэння 1990-х гадоў не аднавілі (у міжваенны час ў горадзе існавалі Беларуская дзяржаўная гімназія, пачатковая беларуская школа, дзіцячы садочак).

У Даўгаўпілсе матулі і бабулі прыводзяць сваіх дзяцей у беларускую нядзельную школу "Вясёлка". У дзіцячай студыі "Скарбніцаў у маладой настаўніцы спяваюць школьнікі з беларускімі каранямі. Гэта арганізаваныя калектывы, удзел у якіх не каштуе ні цэнта, было б толькі жаданне. У сваю чаргу, ініцыятывы ад моладзі амаль што няма, бо ў такім узросце ім не да этнічнай альбо нацыянальнай ідэнтычнасці, да гэтага прыходзяць значна пазней, з жыццёвым вопытам. Мы паказваем сваю беларускасць, не саромімся яе, і калі хтосьці з моладзі прыйшоў да нас сам, то застаецца назусім.

> **Найбольш карысная падтрымка дыяспары — гэта творчыя стажыроўкі для кіраўнікоў ансамбляў і суполак. Мы шмат гадоў жывём не ў беларускім моўным і культурным асяроддзі, таму такое паглыбленне ў культуру — як глыток свежага паветра.**

Фестываль бардаў.

— Нацыянальныя суполкі здатныя не толькі захоўваць гістарычную памяць, але і папулярызаваць беларускую культуру ў іншых краях. Ці ёсць зацікаўленасць беларускім мастацтвам там, дзе вы жывяце?

— Сам факт існавання ў Даўгаўпілсе самай вялікай беларускай суполкі Латвіі і адзінага муніцыпальнага Цэнтра беларускай культуры сведчыць аб тым, што беларуская культура выклікае зацікаўленасць насельніцтва горада, запатрабаваная. Усе публічныя мерапрыемствы беларусаў збіраюць поўныя залы. Пра дзейнасць нашых арганізацый часта пішуць СМІ, нас паважаюць, да нашага погляду прыслухоўваюцца.

Ёсць Беларускі дом з ветлівымі гаспадарамі, куды можна прыйсці, дзе можна сабрацца, зрабіць добрую справу — будзе сапраўдная, разнастайная дзейнасць суполкі. У Даўгаўпілсе дзверы Беларускага цэнтра не зачыняюцца штодзень з ранку да вечара. У 8:30 прыходзяць на працу метадысты, у 20:00 адыходзяць дадому з рэпетыцый удзельнікі ансамбляў.

— Сёння час шмат у чым унікальны. Тэхналогіі, інтэрнэт, новыя формы працы дазваляюць беларусам замежжа жыць у самых розных кутках зямнога шара, але пры гэтым адчуваць сваю непасрэдную датычнасць да культурных традыцый сваёй краіны.

— Мы, дзякуючы розным анлайн-пляцоўкам, маем сувязі з партнёрамі ў Беларусі, а таксама з беларускімі суполкамі ў розных краінах свету: Літва, Эстонія, Расія, Украіна, Іарданія. 2020-ы і 2021-ы гады прайшлі пад знакам мерапрыемстваў у Zoom. Мы чыталі разам Янку Купалу і вершы пра вайну, прэзентавалі новыя кнігі, праводзілі імпрэзы да Масленіцы альбо юбілейных дат беларускіх літаратараў. Напрыклад, міжнародная канферэнцыя "Беларускія чытанні" прайшла ў лютым, да Міжнароднага дня роднай мовы — анлайн з удзелам навукоўцаў і беларусаў замежжа з Латвіі, Беларусі, Эстоніі, Польшчы і Чэхіі. І дыктоўку па беларускай мове таксама пісалі інтэрнацыянальна анлайн. Другі прыклад: з ініцыятывы філалагічнай кафедры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава разам анлайн адзначылі юбілей латышскага паэта і грамадскага дзеяча, абаронцу беларусаў — Райніса. У Даўгаўпілсе мы ўсклалі кветкі на магілу яго бацькі, у Віцебску — да помніка яго маці. А потым віцебскія навукоўцы чыталі свае даклады, а студэнты слухалі; мы паказалі свой спецыяльна зняты відэафільм пра Райніса і Даўгаўпілс, чыталі яго вершы на латышскай, беларускай і рускай мовах. Такія праекты можна назваць "мяккімі", яны не патрабуюць грашовых выдаткаў, а эфект маюць добры.

— Беларусы, якія жывуць за мяжой, могуць спрыяць будаўніцтву краіны, мэтай якой стануць сур'ёзныя вышыні па многіх паказчыках у шэрагу сектараў эканомікі. Якія культурныя праекты, на ваш погляд, маглі б гэтаму садзейнічаць?

— Гэта пытанне дзяржаўнага ўзроўню, нават міждзяржаўнага. На жаль, у сённяшніх геапалітычных абставінах, калі пашыраюцца эканамічныя санкцыі калектыўнага Захаду супраць Беларусі, а ў Мінску і Рызе зачынены пасольствы Латвіі і Беларусі, абмежавана перасячэнне мяжы, у гэтыя віры вольна або мімаволі ўцягваецца культура... Сёння я з цяжкасцю магу сабе ўявіць культурна-эканамічны праект "Дні Латвіі ў Беларусі" ці "Дні Беларусі ў Латвіі", што цікава і эфектыўна працуе.

Але будзем аптымістамі, будзем верыць у разважны сэнс і спрыяць таму, каб пабудаваны культурны мост выстаяў, не разбурыўся.

Якая ідэя наконт культурна-эканамічнай звязкі, напрыклад, у Латвіі. Вышэй было сказана, у Даўгаўпілсе паспяхова штогод восенню праходзіць Міжнародны фестываль "Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе". Гала-канцэрт адбываецца ў гарадскім Палацы культуры, дзе ў вялікай зале 1200 месцаў, ёсць малая зала, вялікія фае на першым і другім паверхах, а перад палацам — плошча. Само слова "кірмаш" мяркуе гандаль, прэзентацыю, выставу. Таму на ўзроўні гандлёва-прамысловых палат Беларусі і Латвіі можна спрабаваць прымеркаваць да фестывалю і арганізаваць выставу беларускіх тавараў, з кантактнай біржай, бізнес-форумам.

Што з боку Беларусі, то таксама на ўзроўні ідэі: штогадовая дзяржаўная цырымонія адзнакі беларусаў замежжа — найлепшы рэалізаваны культурны праект, найбуйнейшы фундатар беларускіх суполак, культурнае адкрыццё года і г.д. Гэта было б вельмі дарэчы.

“Воіны Бога прыйшлі па мяне…” — гэтымі словамі пачыналася малітва пана-латніка Яраша Раўбіча, героя рамана Уладзіміра Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”, калі ў кульмінацыі твора яго прыйшлі забіваць бандыты. Кожны, хто чытаў гэтыя словы, упэўнены, не мог не здрыгануцца. Але, здагадваючыся, што многія па-мастацку пераапрацаваныя вобразы “Каласоў…” адбываліся рэальна, не кожны ведае, што пан Раўбіч быў правобразам багушэвіцкага шляхціца Баляслава Свентаржэцкага. Жорсткі нораў, узяты ад маці, багаты маёнтак, дзе магло сабрацца шмат гасцей, перажыванні ў сувязі з паўстаннем 1863 года… А вышэйпрыведзеная малітва, якую паны-латнікі чыталі толькі перад смерцю, па душэўнаму ўздзеянню можа стаяць побач хіба з сузіраннем фамільнай капліцы-пахавальні сям’і Баляслава ў Багушэвічах, якая, нягледзячы на складаны лёс, усё ж няблага захавалася.

Павел САЛАЎЁЎ.
Фота аўтара.
Мінск —
Беразіно — Мінск

Капліца ў памяць пра сівую даўніну

АГРАГАРАДОК З БАГАТАЙ ГІСТОРЫЯЙ

Аграгарадок Багушэвічы знаходзіцца каля мяжы Мінскай і Магілёўскай абласцей у Бярэзінскім раёне. Упершыню вёска згадваецца ў купчай 1501 года, але сляды першых людзей мілаградскай і зарубянецкай культур знойдзены на мясцовым гарадзішчы стромкага берага ракі Усы. Менавіта тут і размяшчаецца касцельная капліца Божага Цела.

Першы драўляны касцёл у Багушэвічах збудавалі паны Горскія ў 1644 годзе, тады як на тры гады раней у Беразіно паўстаў каталіцкі храм, закладзены слынным Львом Сапегай. Разам з сялянамі ў Багушэвічах пражывала шмат яўрэяў-рамеснікаў, як і ў іншых мястэчках.

У пачатку XIX ст. Багушэвічы выкупае Тадэвуш Свентаржэцкі, які будуе тут маёнтак і, уласна, касцельную капліцу-пахавальню ў неагатычным стыле. Будавалі надзейна: таўшчыня сцен тут прыкладна метровая. Пэўна, і маёнтак, які не захаваўся, быў суадносна ўнушальны. Вядома, што капліцу завяршылі летам 1862 года.

ЛЁС ШЛЯХЦІЦА

Унук Тадэвуша Антоніевіча Свентаржэцкага, Баляслаў Чэслававіч, з якога Караткевіч пісаў свайго героя, у гэты час працаваў пісарам у Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе. Меў выдатную адукацыю: скончыў Віленскі дваранскі інстытут, а затым Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт. Сяброўскія стасункі з уладнымі людзьмі, атрыманыя падчас вучобы, дазволілі прымаць удзел у распрацоўцы ўмоў Сялянскай рэформы. Тым часам дух Асветніцтва, жыва перададзены У. Караткевічам у “Каласах пад сярпом тваім”, не дазволіў яму стаяць убаку лёсу роднага краю...

Сумная гісторыя паўстання прымусіла Баляслава даць бой царскім войскам пад Юравічамі, пасля паразы эміграваць у Францыю, бараніць новую радзіму ў вайне з Прусіяй, служыць у Алжыры, затым скончыць жыццё самагубствам у Венецыі ў 1888 годзе. За ўдзел сына ў паўстанні генерал-губернатар Мураўёў аддаў загад саслаць бацькоў Свентаржэцкіх, а іх радавы маёнтак спаліць. Ад яго цяпер захавалася толькі першая прыступка ганка, якая летам цалкам схаваная бур’яном. Некранутай пакінулі толькі капліцу.

Капліца-пахавальня.

Біскуп Юрый Касабуцкі і ксёндз Андрэй Фёдараў.

КАПЛІЦА-СВЕДКА

У 1869 капліца была асвечана як праваслаўная Свята-Данілаўская. Назва была выбрана не выпадкова: падчас паўстання ў багушэвіцкай праваслаўнай царкве служыў айцец Даніл Канапасевіч, які не ўхваляў мяцеж. Бацюшку павесілі. Па расповедах мясцовай жыхаркі аграгарадка Багушэвічы, прыхаджанкі касцёла Божага цела Таццяны Воюш, за тое датычных смерці святара паўстанцаў царскія войскі падвесілі за ногі на брамах маёнтка Свентаржэцкіх. Менавіта гэтую дэталь паведаміла Таццяне Іванаўне яе сяброўка, якая чула страшэнную падрабязнасць ад сваёй бабулі.

Ляцеў час, і капліца ў Багушэвічах зноў стала каталіцкай падчас польскай інтэрвенцыі. А пасля іх выгнання, за Саветамі, так і засталася ва Усходнім абдакладна хадзілі не сюды, а ў будынак старой царквы.

Пасля склад зерня прыбралі, і тут сталі адбывацца моладзевыя “вячоркі”. На адной такой пасядзелцы, калі адзін з тутэйшых хлапцоў вяртаўся з арміі, а іншы туды адпраўляўся, іх кампанія распаліла вогнішча на старажытным шыкоўным паркеце. Што і казаць, мясцовыя жыхары добра помняць, як гарэла капліца. Незваротна знішчаны і надзвычайнай прыгажосці драўляныя вітражы святыні. Таццяна Воюш узгадвае, што на іх былі па-мастацку выразаны Хрыстова вінаградная лаза і сімвал Багародзіцы — ружа. Адбылося гэта “сумнае свята” прыкладна ў 1989 годзе. Засталіся ад пажару толькі велічэзныя дубовыя лагі і сцены.

Тое, што капліца выкарыстоўвалася як пахавальня, — дакладна. Тут вялікі падмурак і 4-метровы падвал (як бачна на фота), у якім ёсць нішы. У мінулым туды вяла лесвіца, ад яе засталіся толькі чыгунныя парэнчы, якія цяпер ляжаць на дне падвала. Калі адбывалася рэстаўрацыя, выявілі, што дзве нішы былі замураваныя. Якраз два помнікі яшчэ ў Савецкі час стаялі побач з капліцай. Адзін з іх — брату Баляслава, які маленькім утапіўся ў рацэ. Гэты помнік утапілі ў рацэ хлопцы, якім ён перашкаджаў гуляць у футбол. Дарэчы, яшчэ ў час маладосці Таццяны Воюш рака Уса была нашмат больш паўнаводная, чым цяпер.

АДНАЎЛЕННЕ

Капліца была ў заняпадзе да 1999 года, калі на яе звярнуў увагу першы бярэзінскі ксёндз Сяргей Бараўнёў. З дапамогай спонсараў ён замяніў дах, умацаваў старыя лагі і паклаў на іх падлогу. Добраўпарадкаванне святыні працягнуў другі ксёндз, Алег Мурзіч. Пры ім рэгулярна праводзіліся суботнікі, і можна сказаць, цяперашняе наваколле каля капліцы і яе чысціня — яго заслуга. Цяперашні ксёндз Андрэй Фёдараў зрабіў тут зручны ганак і замяніў дзверы. Сёння ж гэты святар аддае ўсю ўвагу будоўлі новага храма ў Беразіно.

Па ўспамінах Таццяны Воюш, у 1999 годзе, калі трэба было рэгістраваць багушэвіцкую парафію, патрэбны мінімум падпісантаў за яе сабралі даволі хутка, проста прайшоўшыся ў адзін канец па вуліцы вёскі. Тады людзі больш цікавіліся рэлігійным жыццём, чым цяпер. Зараз асабліва вялікая колькасць народа збіраецца тут на свята Божага Цела, у гонар якога асвечана капліца. А ў звычайныя нядзелі прыходзяць каля дзесяці мясцовых вернікаў. Нядаўна ў Багушэвічах адчынілася і невялічкая царква, ды толькі ў аграгарадку людзей не большае, і да Бога прыходзяць нешматлікія.

Былы дырэктар багушэвіцкай школы Аляксандр Луста распавёў, што ў Баляслава Свентаржэцкага застаўся нашчадак па лініі маці — Ян Качмарык, які пражывае ў польскім горадзе Уронкі, недалёк ад Познані. Ён прыязджаў сюды неаднаразова, запальваў лампадкі, яшчэ калі рамонту тут не было, і вельмі марыў перавесці прах Баляслава ў адноўленую капліцу. Таксама марыў набыць тут зямлю і адкрыць турыстычны аб’ект. Распавядаў, што ў Парыжы захоўваецца абраз Маці Божай Багушэвіцкай і што ён хацеў бы вярнуць яго на гістарычную радзіму. Праўда гэта альбо не, але напэўна толькі з Божай дапамогай капліца ў Багушэвічах захавалася. Яна сапраўды вартая ўвагі, і, хочацца верыць, самыя дрэнныя часы для яе ўжо мінулі.

К

Заканчэнне.
Пачатак у №№ 33–35

«Крамлёўскія піраты»

А ўся гэтая гісторыя пачыналася так. У 1948 годзе палітбюро ЦК ВКП(б) прыняло рашэнне “Аб выпуску на экран замежных кінафільмаў з трафейнага фонду”. Частку стужак прадпісвалася паказваць “на закрытым экране” — гэта значыць, не ў кінатэатрах, а ў клубах. Чаму? Бо савецкаму кінапракату было што хаваць: нямала тых карцін было знята ў краінах, якія былі нашымі саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны. Як жа яны маглі быць трафеямі Чырвонай арміі?

То-бок на амерыканскія, англійскія, французскія карціны ніякіх правоў у нас не было. З любога пункту гледжання гэтыя паказы былі зусім незаконнымі. Груба кажучы — адкрыты крадзеж. Нават у самой пастанове Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б) — знакамітага агітпропа — недвухсэнсоўна было сказана, што ўся гэтая «аперацыя» робіцца дзеля павелічэння збораў ад пракату.

Сталін, як вядома, з асаблівай пільнасцю праглядаў усе карціны, якія выходзілі на экран. Перад паказам “айцу народаў” фільмы шмат разоў працэджвалі, дрыготкімі ад страху рукамі прыбіраючы ўсё, што магло выклікаць яго раздражненне. Падчас сеанса галоўны глядач мог устаць і сысці, не кажучы ні слова. Для стваральнікаў фільма знак не вельмі прыемны. Або спыніць паказ і пачаць абмяркоўваць убачанае з прысутнымі.

Сталіну, да прыкладу, не спадабалася “Маладая гвардыя” Сяргея Герасімава, і рэжысёр атрымаў ад правадыра ладны наганяй. Фільм тэрмінова і сур’ёзна перарабілі. Тыя, хто бачыў першапачатковы варыянт — які, на жаль, не захаваўся, — казалі, што ён быў значна лепшым. Дасталося і Сяргею Эйзенштэйну за яго другую серыю «Івана Жахлівага» — што, на мой погляд, стала адной з прычын заўчаснага сыходу з жыцця знакамітага кінарэжысёра. За “ідэалагічныя і мастацкія пралікі” Сталін даваў дыхту і Пудоўкіну, і Козінцаву, і Траўбергу, і Цісэ, і Даўжэнку — вядучым на той час майстрам савецкай кінематаграфіі.

Што да замежных фільмаў... У Міністэрстве кінематаграфіі існаваў адмысловы аддзел, які забяспечваў кінапраграму для правадыра. Рыхтаваліся самі фільмы, рыхтаваліся перакладчыкі. З фільмаў прыбіралі рознага кшталту чарнуху і ўсякія там непрыстойнасці, глыбока чужародныя савецкаму чалавеку. Сталін не любіў зацягнутых стужак, і таму карціны скарачаліся. Часам

“Этот фильм взят в качестве трофея...”

Наш час. Дзяржфільмафонд Расіі. пас. Белыя Сталбы Маскоўскай вобласці.

Сховішча фільмаў у Дзяржфільмафондам у пас. Белыя Сталбы.

адмыслова для галоўнага гледача нават рабілі субцітры.

Міністр кінематаграфіі Іван Бальшакоў прывозіў у Крэмль некалькі фільмаў розных жанраў і чакаў ночы, калі Сталін звычайна глядзеў кіно. Потым спрабаваў адгадаць настрой першага цэнзара краіны і ў адпаведнасці з гэтым прапанаваць тую ці іншую карціну — гістарычную драму, вестэрн, камедыю або музычны фільм. Затым сядаў побач з правадыром, рабіў глыбокі ўдых і пачынаў выразна, без запінак, дубляваць стужку. Дыялогі кінагерояў загадзя перакладаліся для Івана Рыгоравіча на рускую мову, і ён іх запамінаў дзякуючы сваім унікальным здольнасцям.

Асабліва Сталін любіў галівудскую прадукцыю. Зрэшты, як Гітлер і Мусаліні. Можа быць, гэта асаблівасць усіх дыктатараў? Дагнаць і перагнаць Галівуд было пастаяннай ідэяй фікс Іосіфа Вісарыёнавіча. Ён марыў, каб у Саюзе рабілася тое самае і нават лепш, але — з адпаведных ідэалагічных пазіцый. Тэрытарыяльна ў якасці савецкага Галівуду разглядаўся Крым, але перашкодзіла вайна...

І вось у сярэдзіне саракавых Сталіну здалося, што грошы на кіно трацяцца дарэмна: большасць савецкіх карцін не надта цікавыя. Акрамя таго, ён убачыў у многіх стужках неадпаведнасць сваім ідэалагічным установкам. І ў выніку ў верасні 1946 года з'явілася жорсткая пастанова ЦК ВКП(б) аб фільмах “Вялікае жыццё” (2-я серыя), “Іван Жахлівы” (2-я серыя), “Адмірал Нахімаў” і “Простыя людзі”. Пасля гэтага кантроль за кінавытворчасцю быў узмоцнены максімальна. Дбайна выбіралі рэжысёраў і сцэнарыстаў. Маладых у прафесіі амаль не засталося — ім баяліся давяраць.

“Дзяўчына” ратуе зборы

Галоўная ідэя Сталіна была ў тым, што карцін павінна быць мала, але кожная мае стаць шэдэўрам, здатным сабраць вялізную аўдыторыю. На некаторыя стужкі — такія як «Маладая гвардыя», “Падзенне Берліна”, “Слова пра зямлю Сібірскую» — народ сапраўды ішоў натоўпамі. Але іх было няшмат. А бясконцыя паўторы нават лепшых савецкіх фільмаў 1930-х гадоў ды стужак з чародамі ўдарнікаў працы і барацьбітамі з класавым ворагам усім надакучылі. Зборы пракату ўпалі, і гэта цяжка ўдарыла па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах. А тавараў у нашых крамах — з камароў нос.

Вось на такім фоне і ўзнікла памкненне запоўніць прарэхі ў пракаце трафейным кіно. Рэакцыю публікі вырашылі правесці на ўжо згаданай вышэй нямецкай музычнай меладраме Георга Якабі «Дзяўчына маёй мары», галоўную ролю ў якой сыграла жонка рэжысёра Марыка Рок.

Гродна. Кінатэатр "Чырвоная зорка". 1950-я гады.

З майго дзяцінства. Кінаперасоўка прыехала на хутар. 1953 г.

Пракатнае пасведчанне гэты фільм атрымлівае 8 красавіка 1946 года. Вядома, стужку падкараціл: прыбралі доўгі пралог і нібыта непрыстойную сцэну купання гераіні ў бочцы. Дарэчы, нажніцы цэнзуры спазнала і трафейная «Мадам Бавары». Пазней я даведаўся, што з яе выразалі сцэну падглядвання старога за распраннанем гераіні. А “Мяцежны карабель” пазбавіўся ажно 50 хвілін сцэн з напаўголымі таіцянкамі.

Да здзіўлення кінаначальнікаў, карціна «Дзяўчына маёй мары» ў пракаце мела неймаверны поспех. У наступным годзе былі запушчаныя яшчэ два пробныя шары: у савецкім пракаце з'явіліся амерыканскія стужкі “Я беглы катаржнік” (у нас ён называўся “Уцёкі з катаргі”) і “Містар Сміт адпраўляецца ў Вашынгтон” (адпаведна — “Сенатар”). І зноў з вялікім поспехам. Апошнюю карціну, праўда, я не бачыў: яе назва зусім мяне не вабіла.

У 1948 годзе на нашы экраны выйшла не менш за паўсотні замежных фільмаў: амаль у пяць разоў больш, чым годам раней. Вядома, кіраўнікі кіно разумелі, што пускаць іх у пракат незаконна. Але адносіны з ЗША былі ўжо і без гэтага замарожаныя, таму крадзеж фільмаў ніяк не мог іх істотна пагоршыць.

Тым не менш узнікае заканамернае пытанне: як амерыканцы рэагавалі на такія факты піратства? Вядома, пратэставалі, пісалі ў замежнай прэсе пра абуральную беззаконнасць рускіх. Ды на іх пратэсты ніхто ўвагі не звяртаў.

Зрэшты, «рускія» імкнуліся асабліва і не злаваць. Амерыканскія фільмы рэдка паказвалі ў буйных кінатэатрах — у асноўным на ўскраінах, у клубах, дамах культуры, на сельскіх перасоўках. Аднак народ нейкімі невядомымі шляхамі адразу даведваўся, дзе і што ідзе, — ды валіў валам.

Здаецца, без настальгіі...

У 12-гадовым узросце я пачаў выключна для сябе весці дзённічак (апошнія яго старонкі пазначаныя 1957-м — годам заканчэння мною сярэдняй школы №7 г. Гродна), куды занатоўваў назвы ўсіх убачаных мною фільмаў ды кароценькія ўражанні ад іх. Большасць трафейных кінастужак я паспеў паглядзець (некаторыя — па некалькі разоў) на сваёй “малой радзіме” — у прыдонскім горадзе Росаш Варонежскай вобласці, дзе нарадзіўся і жыў да 15 гадоў. Быў заўсёднікам адзінага гарадскога кінатэатра «Маяк» на вуліцы Леніна, стараўся не прапускаць і фільмы, якія дэманстраваліся ў двух калгасных клубах і доме культуры на хутары Падгорным.

З фільма "Мост Ватэрлоо". Вівьен Лі і Роберт Тэйлар.

Як правіла, мы, падлеткі, усімі магчымымі і немагчымымі спосабамі імкнуліся пранікнуць у кіназалу без квітка — пагатоў, на большасць карцін дзяцей да 14 гадоў строгія білецёркі не дапускалі. З клубамі было лягчэй, нягледзячы на фармальныя ўзроставыя абмежаванні: плаці рубель за квіток — і наперад. А вось у кіно...

Мы прыдумлялі розныя хітрыкі. То непрыкметна, сагнуўшыся ў тры пагібелі, “прасочваліся” ў залу міма кантралёра ў натоўпе дарослых. То траплялі туды задоўга да чарговага сеансу і, скурчыўшыся пад крэсламі недзе ў заднім шэрагу, ляжалі ў чаканні наплыву гледачоў. І толькі калі на белым экране з'яўляліся доўгачаканыя цітры “Гэты фільм узяты ў якасці трафея...”, можна было расслабіцца і акунуцца ў незнаёмы, таямнічы і чароўны свет “іншага жыцця”.

І ўжо зусім не думалася пра тое, што неўзабаве мяне чакае суровы дзедаўскі суд за самавольную адлучку ў кіно. Ажно да рэменя даходзіла. Праўда, калі дзядуля лагаднеў, ён прасіў пераказаць змест убачанага фільма. І я, захлынаючыся ад захаплення, прыдумляючы на ходу новыя крутыя эпізоды і жэстыкулюючы ўсімі часткамі цела, распавядаў яму і бабулі пра прыгоды каўбояў, каралеўскага пірата Піцера Блада, хітрамудрага Джорджа з Дзінкіджаза, няўлоўнага Зора або каўбоя Рынга Кіда. Дзядуля звычайна слухаў моўчкі, пачухваючы за вухам, толькі зрэдку ківаў галавой. Затое бабуля пры нечаканых паваротах сюжэта ўздыхала і войкала, а калі скончалася ўсё добра — хрысцілася, супакойвалася ды зноў прымалася за адсунутае на час рукадзелле.

А яшчэ дзядуля мяне хваліў, калі я прыносіў у кішэні памятыя рублі, зароблены падчас кінасеансаў. Гэтыя свае першыя ў жыцці “ганарары” я атрымаў у тым самым кінатэатры “Маяк”. Трафейныя фільмы не мелі дубляжу і суправаджаліся субцітрамі. Далёка не ўсе гледачы, асабліва людзі сталага веку, у якіх не надта добра са зрокам, маглі іх хутка прачытаць. Уявіце сабе, што даўжыня субцітраў складала прыкладна 12-15 літар на тры-чатыры секунды паказу! І тады місію чытальніка я браў на сябе. Атрымаўшы згоду бабулі, якая сядзела побач, я ціхенька, стараючыся не перашкаджаць іншым, пераказваў ёй на вуха дыялогі і рэплікі акцёраў. За што і атрымліваў у канцы сеанса заслужанае ўзнагароджанне. Пэўнай таксы, зразумела, у мяне не было, колькі дадуць — столькі і добра. А паколькі адзін і той жа фільм я мог глядзець тры-чатыры разы запар, то сума па маіх тагачасных мерках набягала цалкам прыстойная.

А яшчэ ў нас на вёскі дастаўлялі — на машынах, на падводах, а падчас разліву Дона нават на лодках — так званыя кінаперасоўкі: невялікая электрастанцыя, кінапраектар, гукавая апаратура, цэлулоідныя стужкі ў жалезных скрынках... У зале ставілі дапатопныя венскія крэслы, многія стаялі ўздоўж сцен. Дзеці сядзелі проста на глінянай падлозе перад самым экранам, у ролі якога была нацягнутая белая прасціна...

■■■

Праз чатыры дзясяткі гадоў я займеў магчымасць перагледзець некаторыя з тых даўніх трафейных кінастужак. І тут раптам выявіў дзіўную рэч: гэтыя некалі шалёна любімыя фільмы ўжо не глядзеліся! Не таму, што стужкі, створаныя ў 1930-я — пачатку 1940-х, па сваіх тэхнічных магчымасцях ды праз пэўную наіўнасць сюжэтаў ужо не адпавядалі цяперашняму майму, скажам так, эстэтычнаму густу. Расчараванне мела іншую прычыну. Гэтыя фільмы належалі іншаму часу — таго даўняга дзяцінства. Там яны і засталіся назаўжды — у завулках памяці. І я зразумеў, што туды, у дзяцінства, “візуальнага” вяртання быць не павінна. Нельга трывожыць цені напаўзабытых мараў. А калі ўжо і вяртацца, дык толькі на дыбачках, вельмі далікатна і асцярожна...

Барыс КРЭПАК.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
- Выстава **"Жывапісны жывапіс"** — да 12 верасня.
- **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
- Віртуальная выстава твораў Віталя Чарнабрысава **"Вангогісты Гаген"**.
- Выстава Уладзіміра Мурахвера **"Шкло"**, прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння, — да 30 жніўня.
- **"Рака часу"**. Выстава твораў мастакоў Беларусі — юбіляраў 2021 года ў рамках праекта **"Нашы калекцыі"**.
- Выстава фарфору Эміліі Аляксандраўны Фокінай **"Мір фантазій"**.
- Выстава **"Агнявідныя і агняпальныя..." Ікона Веткі** — з 24 ліпеня да 12 верасня.
- Выстава **"Святлана Каткова. Рэтраспекцыя"** з 23 жніўня.
- **"Леў Лейтман. Да 125-годдзя з дня нараджэння / Графіка"** з 12 жніўня да 6 верасня.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 358 88 78

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
- **Займальныя майстар-класы** па саломапляценню, вырабу традыцыйных лялек, пляценні паясоў (бранзалетаў). Патрапіць на майстар-клас можна ў любы працоўны дзень музея: серада — нядзеля з 10.00 да 17.00. Папярэдні запіс абавязковы.
- Фотапраект італьянскага мастака Паола Ладамада **"AFRICA SOUL"** — да 31 жніўня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Някрасава, 3.
Тэл.: 399-09-78
Час працы: серада — нядзеля з 12:00 да 20:00
- Выставачны праект **"Адкрыты архіў VL"**, прысвечаны 70-гадоваму юбілею Валерыя Лабко.
- Персанальная выстава графікі Юрыя Якавенкі **"Астральны нацюрморт"**.
- Выстава маляванак **"Зоры-Зараніцы"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30) панядзелак — выхадны.
Пастаянная экспазіцыя.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА "НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19 тэл.:+375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149

Палацавы ансамбль:
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выставачны праект **"Захавальнікі"** з фондаў музея-запаведніка "Нясвіж" (куфры, шкатулкі, скрыні XVII — XX стст.) — з 26 сакавіка 2021 г. па 20 верасня 2021 г.
- Выставачны праект **"Несучаснае мастацтва"** твораў М.Байрачнага і Ю.Гудзіновіча — з 20 ліпеня па 14 лістапада 2021 г.
- Міжнародны выставачны праект "Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара" — у складзе пастаяннай экспазіцыі.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці:
г. Нясвіж, вул. Гейсіка,1
- Часовая экспазіцыя твораў Леаніда Гоманава "Фарбы зямлі" — з 3 жніўня 2021 г. па 30 верасня 2021 г.

Ратуша:
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3
- Пастаянная экспазіцыя.

Слуцкая брама:
- Персанальная выстава Карыны Гінько — з 21 мая па 4 кастрычніка 2021 г.

Падрабязную інфармацыю можна даведацца па тэлефонах — (+3751770) 20602, (+3751770) 20660, альбо на сайце niasvizh.by.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
- Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
- Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
- Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
- Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар..."**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
- Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
- Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
- Музейная фотапляцоўка.
- **Квэст "Таямніца двух куфраў"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

- Фестываль мастацтва "Арт-Мінск-2021" з 3 жніўня да 26 верасня.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белдрук"	кіёскі "Белдрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	Праспект Пераможцаў, 5.
Праспект Незалежнасці, 44.	Вуліца Рабкораўская, 17.
Вуліца Валадарскага, 16.	Праспект Незалежнасці, 68, В.
	Вуліца Лабанка, 2.

Тэлефон для даведак па наяўнасці газеты ў кіёсках "Белдрук" — (017) 2764542 (з 9.00 да 17.30)

Мінск. Верхні горад. 11 верасня

Ужо праз тыдзень адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

У рамках адкрыцця фестывалю з 12:00 да 17:00 пройдзе канцэртная праграма з удзелам творчых калектываў і індывідуальных выканаўцаў 25 нацыянальнасцей (азербайджанцы, армяне, афганцы, беларусы, башкіры, грузіны, дагестанцы, яўрэі, ірландцы, італьянцы, індыйцы, карэйцы, кітайцы, літоўцы, малдаване, немцы, палякі, палестынцы, рускія, татары, туркмены, украінцы, цыганы, чувашы, эстонцы).

У якасці запрошаных гасцей удзел у канцэрце прымуць Заслужаны калектыў дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі — вядучы харэаграфічны калектыў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча, салісты Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца «Дружба» і інш.

На тэрыторыі Верхняга горада таксама будзе размешчана выстава традыцыйных касцюмаў і прадметаў побыту нацыянальных культур, будуць прадстаўлены вырабы народных рамёстваў Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, рэстараны Мінска прадставяць стравы нацыянальнай кухні.

Плануецца, што ў афіцыйным урачыстым адкрыцці фестывалю (у 13:00) прымуць удзел прадстаўнікі кіраўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, прадстаўнікі Пасольстваў замежных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь, СМІ, старшыні нацыянальна-культурніцкіх грамадскіх аб'яднанняў.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").